ПРАЛЕТАРЫЯ ЎСІХ КРАЇН ЗЛУЧАЙЦЕСЯ! פּראָלעטאַריער פון אַלע לענדער, פאַרייניקט זיך! ПРОЛЕТАРИИ ВСЕХ СТРАН, СОЕДИНЯЙТЕСЬ! PROLETARJUSZE WSZYSTKICH KRAJÓW, ŁĄCZCIE SIĘ!

адрэс РЭДАКЦЫІ І КАНТОРЫ: Менск, Пляц Волі № 11, 1-шы паверх

ТЭЛ. Сакратара—№ 478 Рэдактара—№ 769 Канторы—№ 244 Сэктара прамысловасьці—№ 615

XI ГОД ВЫДАНЬНЯ ШТОДЗЁННАЯ

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

№ 34 (3123) АЎТОРАК 10 ЛЮТАГА 1931 ГОДУ

КОШТ НУМАРУ 5 КАП.

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц . — 90 к. 3 „ . 2 р. 70 к. 6 „ . 4 р. — к. 1 год . 8 р. — к.

Камітэту Саветаў Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў і Савету Народных Камісараў Б. С. С. Р.

Алма-Ата, Ленина
гос.публичн.библ-ка
в.янв.32 г. (СБ-1)

СЕНЬНЯ адчыняецца II зьезд ТДА-Авіяхэму БССР

дзесяцігадовы юбілей Аб'яднанай Беларускай Вайсковай Школы

II зьезду ТДА-Авіяхэму юбіляру—АБВШ

БАЛЬШАВІЦКАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ

Быць заўсёды на варце

Крызіс сусьветнага капіталізму паглыбляецца і пашыраецца. Кожны дзень на вуліцу выкідаюцца новыя тысячы рабочых, кожны дзень расьце армія беспрацоўных, армія галадаючых. У сучасны момант ва ўсіх капіталістычных краінах каля 35 мільёнаў беспрацоўных, а з сем'ямі армія галадаючых беспрацоўных перавышае сотню мільёнаў. Сусьветны эканамічны крызіс—крызіс перавытворчасьці, з якога капіталізм ня можа знайсьці выхаду. У той час, калі на складах ляжыць вопратка, мільёны рабочых ходзяць абадраныя; у той час калі на складах ёсьць абутак, мільёны ходзяць босыя і у лапцёх; у той час, калі склады завалены пшаніцай—сотні тысяч паміраюць галодный сьмерцю. Сьмерць з голаду—штодзённая зьява ва ўсіх капіталістычных краінах. Кожны дзень газэты паведамляюць аб масавым выміраньні з голаду ў Індыі, Індакітаі, Кітаі і ў самых капіталістычных краінах і гэта ў той час, калі склады завалены збожжам, калі трэсты магнатаў-абшарнікаў апальваюць збожжам параходы і г. д.

Капіталісты бачуць выхад з эканамічнага крызісу ў новай імпэрыялістычнай вайне. Тут яны спадзяюцца, з аднаго боку, пазбавіцца беспрацоўных, пусьцёўшы іх на гарматнае мяса, а другога боку, перадзяліць рынак збыту, сфэры ўплыву, збыць заляжалыя тавары. І да гэтай імпэрыялістычнай вайны шалёным тэмпам рыхтуюцца ўсё капіталістычныя краіны. Абастрыліся да надзвычайнасьці ўсе супярэчнасьці капіталізму. Путы Вэрсалю, якія скоўваюць Нямеччыну, трашчаць па ўсіх швох. У парадак дню пастаўлены перагляд границ.

Надзвычайна абвастрылася аконўная і галоўная супярэчнасьць паміж капіталістычным сьветам цалкам і краінай пралетарскай дыктатуры СССР. Імпэрыялістычныя дранежнікі ўзмоцнена працуюць над згуртаваньнем антысавецкага блёку, над адзіным фронтам ўсіх буржуазных краін супроць СССР. Французскія імпэрыялісты зьяўляюцца галоўнымі натхніцелямі і кіраўнікамі ўсёй антысавецкай кампаніі і падрыхтоўкі да ўзброенага нападу на СССР. Спробы арганізаваць так званую пан-Эўропу ні што іншае, як спробы арганізаваць, каардынаваць і падпарадкаваць французскаму генштабу ўсю работу па правядзеньні «крыжовага паходу» супроць СССР. Мы бачым, што побач з шалёным узбраеньнем, побач з ростам сукапутных, морскіх і паветраных сродкаў зьнішчэньня, буржуазія праводзіць фашызацыю сваіх дзяржаўных апаратаў і лютым белым тэрорам жорстка распраўляецца з рэвалюцыйным рухам; дзікімі катаваньнямі, катаржнымі прысудамі заспакойвае тылы на выпадак вайны. Паруч з гэтым вядзецца самая дзікая, самае гнаёбае ўкраіньне СССР. Хлусьня аб «савецкім дэмпінгу», клусьня аб «прымусовай працы»—гэта адно са зьвяньняў у падрыхтоўцы да ўзброенага нападу на краіну Саветаў.

За апошні час наглядаем, што прымежныя з намі краіны, Польшча, Румынія, Фінляндыя і г. д. на загаду французкага генштабу, асабліва вялікую ролю павінны ўзмоцнена выдаць цкаваньне СССР, узмоцнена рыхтуюцца да ўзброенага нападу на краіну саветаў. Апошнія выпады фінскіх фашыстаў, іх правакацыйнае парушэньне савецкай мяжы—зьяўляецца лепшай ілюстрацыяй таго, што сусьветны імпэрыялізм усімі сіламі імкнецца справакаваць на вайну Савецкі Саюз.

Мы будуем сацыялізм, мы будуем новыя фабрыкі і заводы, мы пераўтвараем дробныя раскіданыя бядняцка-серадняцкія гаспадаркі ў буйныя сацыялістычныя. Партыя і ўрад нязьменна пасьлядоўна праводзяць палітыку міру, не паддаючыся на правакацыі сусьветных імпэрыялістаў. Разам з тым мы ні на хвіліну не павінны забывацца, што імпэрыялісты гатовы напасьці на нас кожны дзень, таму мы ў кожную хвіліну павінны быць гатовы да рашучага зьнішчальнага адпору.

На намеры нашых ворагаў, на намеры сусьветнага імпэрыялізму працоўныя масы Савецкага Саюзу адказваюць яшчэ большай згуртаванасьцю вакол ленінскай камуністычнай партыі, яшчэ з большай напружанасьцю сіл і энэргіі выконваюць планы вялікіх работ—пяцігодку ў 4 гады. На намеры нашых ворагаў бядняцка-серадняцкія масы сялянства пад кіраўніцтвам пралетарыяту і яго авангарду—камуністычнай партыі яшчэ шырэй разгорнуць сацыялістычнае будаўніцтва калгасаў і на базе суцэльнай калектывізацыі ліквідацыю кулацтва, як клясы.

Сёньня ў чырвонай сталіцы БССР—Менску адчыняецца II-гі Ўсебеларускі зьезд ТДА-Авіяхэму. На гэтым зьезьдзе будзе падагулена тая вялізарнейшая работа, якую правёў ТДА-Авіяхэм у справе садзейнічаньня сацыялістычнаму будаўніцтву і падрыхтоўкі працоўных Савецкай Беларусі да абароны. На гэтым зьезьдзе будуць намечаны новыя практычныя шляхі і мерапрыемствы да яшчэ большага разгортваньня работы дабраахвотнага т-ва Авіяхэму.

БССР, як надзейны форпост Савецкага Саюзу, які знаходзіцца на мяжы з капіталістычным сьветам, павінна быць аднэй з перадавых атрадаў па вайсковых ведах. Кожны рабочы, кожны калгасьнік, бядняк і серадняк павінен ня толькі быць гатовым у кожную хвіліну аддаць жыцьцё за сваю савецкую рэспубліку, за сваю ўладу, але павінен добра ўладаць зброяй, павінен добра ўладаць новымі тэхнічнымі вайсковымі прыладамі. Мы ўпэўнены, што той уздым, які быў адзначаны ў «дэкаду абароны», цяпер яшчэ больш узрасьце. Ячэйкі ТДА-Авіяхэму павінны прыкласьці ўсе сілы да таго, каб ніводнага рабочага, ніводнага калгасьніка і бядняка ня было па за радамі ТДА-Авіяхэму. Кожны працоўны павінен быць членам ТДА-Авіяхэму. І калі да сучаснага моманту наглядалася некаторая недаацэнка з боку партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый работы ТДА-Авіяхэму, дык цяпер дасягнуты пералом у «дэкаду абароны» павінен быць замацаваны, паглыблены і пашыраны. Асабліва вялікую ролю павінны адыграць камсамольцы па ўцягненьні моладзі ў рады ТДА-Авіяхэму. Тут у камсамольцаў не пачаты край работы, бо яшчэ да гэтага часу значная частка калгасьнікаў, асабліва калгасьніц, бяднячак і сераднячак ня ўцягнуты ў рады ТДА-Авіяхэму, да гэтага па за радамі товарыства знаходзіцца і рад камсамольцаў.

Сёньня мы адзначаем слаўны юбілей АБВШ імя ЦВК БССР. Гэта школа за свае слаўныя 10 год творчай работы, падрыхтавала маладых байцоў ня толькі як вайсковых спэцыялістаў, але як адданых салдат пралетарскай рэвалюцыі, як адданых надзейных барацьбітаў за генэральную лінію партыі як работнікаў на культурным фронце. Пралетарыі БССР, пасылаючы бальшавіцкае прывітаньне, яшчэ большай увагай, яшчэ большай любоўю прасякнуцца да аднаго з лепшых атрадаў нашай слаўнай гераічнай Чырвонай армії. Таварыскае садружацтва, штодзённая дапамога і штодзённая сувязь прадпрыемстваў, калгасаў з часьцямі Чырвонай армії, штодзённая дапамога і клопаты аб падборы лепшых, найбольш адданых справе рэвалюцыі барацьбітоў у школу з рабочых і калгасьнікаў—зьяўляецца задачай усіх партыйных, прафэсыяльных і савецкіх арганізацый.

Праводзячы няўхільна палітыку міру, мы з яшчэ большай энэргіяй, з яшчэ большай сілай будзем рыхтавацца да абароны, каб у кожную хвіліну спаткаць ворага гатовымі, каб межы Савецкага Саюзу, як і ўвесь Савецкі Саюз былі непрыступнай цытадэллю для буржуазіі, цытадэллю міжнароднай пралетарскай рэвалюцыі.

Няхай жыве Чырвоная армія!

Няхай жывуць юбіляры, школа АБВШ імя ЦВК!

Няхай жыве ТДА-Авіяхэм!

Няхай жыве камуністычная партыя—правадыр і арганізатар сацыялістычнага будаўніцтва і абароны СССР!

Са звароту СНК СССР і ЦК УсеКП(б) да ўсіх партыйных, савецка-гаспадарчых водна-транспартных, прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый аб рачным транспарце

За подпісам старшыні Савету Народных Камісараў СССР тав. Молатава і сакратара ЦК УсеКП(б) тав. Сталіна агалошаны зварот СНК СССР і ЦК УсеКП(б) да ўсіх партыйных, савецка-гаспадарчых, водна-транспартных, прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый аб рачным транспарце. Пастанова канстатуе, што рост народнай гаспадаркі СССР патрабуе ад рачнога транспарту карэннай перабудовы яго работы ў адпаведнасьці з тэмпамі разгорнутай сацыялістычнай рэканструкцыі. Гаспадарчы стан рачнога транспарту не адпавядае ўзросшым да яго запатрабаваньням з боку народнай гаспадаркі.

Улічваючы ўсё гэта СНК СССР і ЦК УсеКП(б) лічаць неабходным безадкладна правесьці ў жыцьцё наступныя мерапрыемствы.

Наркамвод прапануецца ў дзьвухмесячны тэрмін скончыць распрацоўку плану рэканструкцыі рачнога транспарту. Не чакаючы поўнай распрацоўкі плану рэканструкцыі, павінны быць устаноўлены на паасобных басэйнах і родах грузаў найбольш рацыянальныя тыпы судоў, рэканструяваны існуючыя сударамонтныя майстэрні і г. д. Для гэтага павінны быць скарыстаны адпускаемыя на капітальныя работы ў рачным транспарце на 1931 год 215 мілёнаў руб.

ВСНГ абавязваецца скласьці цьвёрды календарны план па выпуску суднаў, бязумоўна, абавязковы да выкананьня, з тым, каб забясьпечыць выпуск у тэрмін суднаў, прызначаных да навігацыі 1931 г. У дзьвухдэкадны тэрмін ВСНГ павінен заключыць за суд набудаўнічай прамысловасьцю неабходныя заводы, выробляючыя падсобныя механізмы, а таксама вылучыць дадаткова з рэзэрвнага фонду 50 мільёнаў руб. для патрэб рэканструкцыі суднабудаўніцтва і набудовы новых верфяй, у прыватнасьці чырвонаармейскай, пермскай і дашчаніцкай. Наркамвод і ВСНГ павінны ў месячны тэрмін вырашыць пытаньне аб тыпу бэнзінавозу і супольна намецьць плян будаўніцтва бэнзінавозаў, як на водах Рэчгасюзверфі, так і ў майстэрнях аб'яднаньня рачнога транспарту, у месячны тэрмін павінны быць вызначаны заводы, на якіх можа быць разгорнута будаўніцтва тэхнічнага рачнога флёту.

Не пазьней 1 сакавіка 1931 году павінен быць скончан перавод на гаспадарчы разьлік усіх суднарамонтных майстэрняў першага і другога разраду. Важнейшыя заводы і майстэрні ў затонах павінны быць аб'яднаны ў самастойныя гаспадаркі аб'яднаньня па рамонту суднаў. За сваячасовае выкананьне плянаў суднабудаўніцтва і рамонту павінны несьці пэрсанальную адказнасьць начальнікі затонаў і адміністрацыя цэхаў.

З мэтаю ўзмацненьня тэмпаў мэханізацыі пагрузачна-разгрузачных работ на водным транспарце Наркамвод абавязваецца разгарнуць ва ўласных майстэрнях выраб прасьцейшых сродкаў мэханізацыі і распрацаваць канкрэтны плян правядзеньня мэханізацыі пагрузачна-разгрузачных работ на водным транспарце.

Прымаючы пад увагу, што суднаходныя рэкі, у тым ліку такія важнейшыя артэрыі, як Волга і Дняпро вельмі запушчаны, што стварае пагрозу нармальнаму суднаходству, Савет Працы і Абароны паручае разглядзець пытаньне аб сістэматычным учарэрканьні судаходных рэк. Мясцовым выканкомам ставіцца ў абавязак прыняць меры па ачышчэньні мясцовых рэк і забясьпячэньні нармальных лясных сплаваў.

Да 1 сакавіка для паўднёвых раёнаў і да 15 сакавіка для паўночных раёнаў павінны быць распрацаваны і паведамлены на месцы цьвёрдыя пляны перавозак у навігацыю 1931 году. Пры гэтым павінна быць устаноўлена матар'яльная і судовая адказнасьць кліентуры за непрадстаўленьне грузаў у вызначаныя плянам тэрміны і такая-ж адказнасьць водпага транспарту за непадачу танажу і цягі.

Арганізацыйная структура рачнога транспарту карэнным чынам зьмяняецца. Судно, як первясковая гаспадарчая адзінка, прыраўноўваецца да прадпрыемства, павінна працаваць на аснове гаспадарчага разьліку і мець цьвёрды прамфінплян.

Арганізуецца да 50 раённых кіраўніцтваў рачнога флёту. Замест існуючых 23 дзяржпараходствадаў ствараюцца наступныя 15 пароходстваў: Волжскае, Маскоўска-Окскае, Камскае, Дняпроўскае, Днепра-Дзьвінскае, Паўночна-заходняе, Паўночнае, Дона-Кубанскае, Закаўказкае, Сярэдня-Азіяцкае, Заходнее-Сібірскае, Енісейскае, Усходня-Сібірскае, Ленскае і Амурскае. Апроч таго, на рацэ Урал ствараецца раённае кіраўніцтва, падначаленае непасрэдна Наркамводу. Існуючыя агенцтвы Дзяржпараходства скасоўваюцца.

У мэтах лепшай работы каманданага складу пароходаў, замацаваньня кваліфікаваных кадраў рабочага і каманднага складу на рачным транспарце і кадвышэньня прадукцыйнасьці іх працы, Наркамвод сумесна з ЦК водніжаў абавязваецца ў месячны тэрмін правесьці павялічэньне зарплаты работнікаў рачнога транспарту, зьвязанае з падвышэньнем якасьці работы. Дадатковая да тарыфнай аплаты ўводзіцца тона-кілёмэтравая аплата працы для капітанаў, мэханікаў, памоцнікаў капітанаў і мэханікаў, старшых лоцманаў, рулевых, масленшчыкаў і качагараў, пры чым для апошніх яшчэ ўстанаўліваюцца прэміраваньні за эканомію апалу.

Да 1 сакавіка гэтага году павінна быць створана водная каапэрацыя на структуры, устаноўленай для каапэрацыі рабочых чыгуначнікаў. Наркамсабу і Цэнтрасаюзу даручаецца арганізаваць закрытыя разьмеркавальнікі ў найбольш буйных затонах і водных басэйнах, забясьпечыўшы іх рэгулярным забесьпячэньнем па вызначаных нормах.

Адзначаючы што партарганізацыі рачнога транспарту зьяўляюцца найбольш адсталымі ў пастаноўцы партыйнай і масава-выторчай работы ў параўнаньні з партарганізацыямі іншых галін народнай гаспадаркі, ЦК УсеКП(б) і СНК прапануюць мясцовым партыйным і камсамольскім арганізацыям цэнтр увагі ўсёй работы згуртаваць на рашучай барацьбе з прагулямі, рвацтвам, за ўздым працоўнай дысцыпліны, абапіраючыся на перадавыя пласты рабочых водпага транспарту—на ўдарнікаў.

АБВШ—ордэн працоўнага чырвонага сьцягу

ПАСТАНОВА

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

ДА ДЗЕСЯЦІГОДЗЬДЗЯ ІСНАВАНЬНЯ АБ'ЯДНАНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ВАЙСКОВАЙ ШКОЛЫ ІМЯ ЦВК БССР.

10-га лютага 1931 г. спаўняецца дзесяць год існаваньня Аб'яднанай Беларускай Вайсковай Школы імя ЦВК БССР. Заснаваная ў часы грамадзянскай вайны Аб'яднаная Школа за час яе існаваньня адыграла вялікую ролю ў справе падрыхтоўкі чырвоных камандзіраў для нацыянальных і тэрытарыяльных вайсковых часьцей. Рыхтуючы для Чырвонай арміі загартаваных чырвоных камандзіраў з лепшых рабочых, батракоў, сялян-беднякоў і актывістых-сераднякоў, Аб'яднаная Школа дала за гэты час Чырвонай арміі сотні клясава сьвядомых, узброеных палітычнымі і ваеннымі ведамі і адданых рабочай клясе ў барацьбе за сацыялізм, камандзіраў і гэтым з гонарам выконвала сваю задачу—узмацненьня баяздольнасьці Чырвонай арміі і абароназдольнасьці Савецкай краіны.

Адзначаючы выдатныя заслугі Аб'яднанай Беларускай Вайсковай Школы імя ЦВК БССР у справе падрыхтоўкі чырвоных камандзіраў, Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Узнагародзіць Аб'яднаную Беларускую Вайсковую Школу ордэнам Працоўнага Чырвонага Сьцягу.

2. Адзначаючы заслугі палітычна-каманднага складу Школы ў справе добрай падрыхтоўкі вайсковых кваліфікаваных кадраў, узнагародзіць:

а) аружам і граматамі ад Прэзыдыуму ЦВК БССР наступных асоб з палітычна-каманднага складу:

Васілевіча І. І., Конюхава Н. Г., Вярпэню П. М., Саветнікава Я. Г., Уласава М. С., Леаненка, Гаранскага, Проніна, Якубовіча, Міларадава, Казлоўскага, Пякурына, Караулава, Храбрага, Власава С., Ачкасава; Гарбатава, Дабралюбава, Федаровіча.

б) Пачэснымі граматамі ЦВК БССР наступных асоб з палітычна-каманднага складу:

Жырковіча, Балотнікава, Побылеца, Ганчарыка, Сырэца, Гербаноўскага, Гарошка, Гусева, Раманава, Кавалева, Ермакова, Савінава, Пельверта, Парыскага, Брэхава, Хутарцова, Грабоўскага.

3. Узнагародзіць Пачэснай Граматай Прэзыдыуму ЦВК наступных курсантаў Школы, як праявіўшых сябе клясава-вытрыманымі, палітычна-сьвядомымі і найбольш старанымі ў справе падрыхтоўкі да высокага званьня Чырвонага камандзіра:

Сянкевіча Пятра, Літвінава Пятра, Ермалаева Ўладзіміра, Фралкова Марку, Лістрацонка Базыля, Базыленка Ўладзіміра, Казакевіча Паўла, Фралова Антона, Філончыка Тодара, Ляшчыніна Базыля, Кіяшка Мікалая, Котава Івана, Маргелава Базыля, Казлова Луку, Дзеркача Івана, Удотава Алеся, Мазюка Зьмітра, Барадулькіна Рыгора.

Прэзыдыум ЦВК выказвае ўпэўненасьць, што выхаванцы А.Б.В.Ш. імя ЦВК, атрымаўшы бальшавіцкае загартаваньне і вайсковую падрыхтоўку ў школе пад кіраўніцтвам лепшых настаўнікаў—удзельнікаў грамадзянскай вайны, будуць на належнай вышыні свайго пачэснага званьня Чырвоных камандзіраў і з гонарам выконваць свой баявы абавязак па абароне Пралетарскай Рэвалюцыі ў час, калі гэтага ад іх патрабуе камуністычная партыя і Савецкі Ўрад.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР.
А. ЧАРВЯКОЎ.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. ХАЦКЕВІЧ.

9 лютага 1931 г.
Гор. Менск.

Да міжнароднага дня барацьбы з беспрацоўем

Усім Райкомам, Гаркомам і ячэйкам МОПР'у БССР

Усім прафэсыянальным арганізацыям БССР

АДОЗВА ЦК МОПР'у БССР і ЦСПСБ.

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

«Капіталістычныя краіны перажываюць глыбокі сусьветны эканамічны крызіс. Гэта ёсьць крызіс перавытворчасьці. Гэтую перавытворчасьць тавараў (мануфактуры, хлеба) капіталісты хаваюць на складах або зьнішчаюць каб утрымаць высокія цэны. Вытворчасьць скарачаюць, рабочых звальняюць і працоўныя масы пакутуюць з-за капіталістычнай рацыяналізацыі». (Сталін).

Крызіс прамысловасьці ў капіталістычных краінах супадае з крызісам сельска-гаспадарчым, што надае сусьветнаму эканамічнаму крызісу асабліва вострыя формы.

Расьце і павялічваецца армія беспрацоўных, якая дасягае 30 мільёнаў чалавек (Амэрыка—10.000.000, Нямеччына—4.700.000, Англія—3.000.000: Польшча—400.000), а калі яшчэ дадаць членаў сямей беспрацоўных, дык армія галодных даходзіць да 70.000.000 чал. Абастраецца клясавая барацьба паміж працай і капіталам. У радзе буржуазных краін эканамічны крызіс перарастае ў палітычны.

Буржуазія ў барацьбе з рэвалюцыйным рухам ужывае нячуваныя мэтады белага тэрару. 1.500.000 забітых, замучаных, сасланых на катаржныя работы, кінутых у турмы—вось «крывавы балянс» белага тэрару буржуазіі за апошнія 5 год.

Побач з вялікім ростам беспрацоўя, у краінах капіталу ўзьмацняецца рэвалюцыйная актыўнасьць пралетарыяту, які выступае пад выразным лёзунгам Камуністычнага Інтэрнацыяналу—«Кляса—супроць клясы».

Эканамічны крызіс капіталізму, рост беспрацоўя, абвостраная клясавая барацьба адбываюцца ў перыяд, калі ў нашай савецкай краіне шпарымі тэмпамі будуецца сацыялізм. Посьпехі пяцігодкі, узятыя сапраўды бальшавіцкія тэмпы індустрыялізацыі зьлівідавалі зусім у нашай Савецкай краіне беспрацоўе. Не хапае рабочай сілы. Гэта яшчэ больш рэвалюцыянізуе міжнародны пралетарыят, які змагаецца з капіталістычнай «рацыяналізацыяй».

25-га лютага міжнародны пралетарыят праводзіць дзень барацьбы з беспрацоўем, барацьбы супроць капіталістычнай рацыяналізацыі, за абарону Савецкага Саюзу.

Цэнтральны Камітэт МОПР'у БССР і ЦСПСБ заклікаюць усе прафэсыянальныя і МОПР'аўскія арганізацыі распачаць шырокую масавую растлумачальную работу па папулярызацыі інтэрнацыянальнага значэньня Міжнароднага дня барацьбы з беспрацоўем, непасрэдная дапамогі пралетарыятам Савецкага Саюзу беспрацоўным і іх сем'ям капіталістычных краін, які выконвае гэтым свой абавязак пралетарскай салідарнасьці.

ЦК МОПР'у БССР і ЦСПСБ заклікаюць прыступіць да правядзеньня індывідуальных і групавых гутарак з рабочымі, калгасьнікамі і саўгасьнікамі аб Міжнародным дні барацьбы з беспрацоўем, увязваючы гэтае пытаньне з задачамі па інтэрнацыянальным выхаваньні, з удзелам рабочых і працоўных мас у сацыялістычным будаўніцтве, шырока растлумачыць працоўным масам прычыны росту беспрацоўя ў капіталістычных краінах і, галоўныя чынам увязаць гэтыя гутаркі з узмацненьнем работы па правядзеньні кампаніі зімовае дапамогі палізьняволеным і іх сем'ям.

ЦК МОПР'у БССР і ЦСПСБ заклікаюць усе мопраўскія арганізацыі разгарнуць масавую работу вакол шэфства над палітзьняволенымі, якія пакутуюць у турмах капіталістычных краін. Шырока інфармаваць працоўныя масы аб эканамічным і палітычным становішчы краін, у якіх яшчэ знаходзяцца палітэфныя турмы.

Надаючы вялікае палітычнае значэньне Міжнароднаму дню барацьбы з беспрацоўем, Цэнтральны Камітэт МОПР'у БССР і ЦСПСБ лічаць неабходным працягнуць кампанію зімовай дапамогі да 1-га сакавіка 1931 г. з мэтай, каб усе арганізацыі і ўсе працоўныя БССР прынялі самы актыўны ўдзел у арганізацыі збору матар'яльных сродкаў для дапамогі беспрацоўным рабочым і іх сем'ям, палітзьняволеным, кінутым за турэмныя краты за сваё змаганьне з капіталістычнай рацыяналізацыяй».

ЦК МОПР'у БССР і ЦСПСБ заклікаюць усіх працоўных выказаць свой доўг пралетарскай салідарнасьці перад 30-цімільённай арміяй беспрацоўных і іх сем'яў, стотысячнай арміяй палітзьняволеных, якія пакутуюць у каменных мяшкох капіталістычных краін—у Міжнародны дзень барацьбы з беспрацоўем выказаць сваю салідарнасьць актыўнай матар'яльнай і маральнай дапамогай, уцягненьнем новых шырокіх колаў працоўных у рады МОПР'у, арганізацыяй ударных брыгад, калгасаў і саўгасаў імя МОПР'у, рэвалюцыйных дзеячоў.

Асноўнымі лёзунгамі пры правядзеньні Міжнароднага дня барацьбы з беспрацоўем павінны быць:

Усе на дапамогу галадаючым рабочым, беспрацоўным і іх сем'ям.

У Міжнародны дзень барацьбы з беспрацоўем пралетарыят Савецкага Саюзу дэманструе свае бальшавіцкія тэмпы працяга рашаючага году пяцігодкі.

Усе на дапамогу ахвярам фашызму—барацьбітом супроць капіталістычнай «рацыяналізацыі», супроць беспрацоўя!

Усе на дапамогу сацыялістычнаму будаўніцтву, за ўзмацненьне абароназдольнасьці СССР!

Шчыльней згуртуемся вакол камуністычнай партыі!

Узмоцнім тэмпы 3-га рашаючага году пяцігодкі—фундаманту пабудовы сацыялістычнай эканомікі!

ЦК МОПР'у БССР
Цэнтральны Савет Прафэсыянальных Саюзаў Беларусі.

Да другога ўсебеларускага зьезду ТДАА-віяхэму

Ад I зьезду да другога прайшло 2 гады і 8 месяцаў. За гэты час значна зьмянілася міжнароднае становішча, значна вырасла небясьпека нападу на Савецкі Саюз, павялічылася пагроза вайны супроць СССР з боку капіталістых. Крызіс у капіталістычных краінах усё больш і больш абвастраецца, абвастраюцца і клясавыя супярэчнасьці ў капіталістычных краінах.

СССР, уступіў у перыяд сацыялізму. Посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва СССР павялічваюць нянавісьць з боку імпэрыялістаў да СССР. Разгорнуты наступ сацыялізму выклікае супрацьўленьне клясавага ворага ўнутры СССР.

Ліхаманкавая падрыхтоўка сусьветнага імпэрыялізму на чале з Францыяй да інтэрвэнцыі супроць СССР, падтрыманьне інтэрвэнтаў з боку кулацтва, шкодніцкай часткі буржуазных спэцыялістых, а таксама ў нас у БССР з боку контррэвалюцыйных беларускіх нацдэмаў, патрабуе ад усіх працоўных і ў першую чаргу ад нашага таварыства яшчэ большага згуртаваньня сваіх сіл вакол кампартыі, патрабуе асаблівай старожнасьці і падрыхтаванасьці.

Наша таварыства падыйшло да зьезду пасьля ўсеагульных перавыбараў, якія разгарнуліся пасьля «дэкады абароны» і перавучоту арганізацыі.

У гэтым годзе справаздачна-перавыбарчая кампанія таварыства прайшла пры значна большай масавасьці ў параўнаньні з мінулымі. Праведзеныя раённыя і гарадзкія канфэрэнцыі ў большасьці раёнаў паказалі колькасны і якасны рост арганізацыі. На мінулай Гомельскай раённай канфэрэнцыі было каля трох дзесяткаў дэлегатаў, тымчасам як у гэтым годзе каля—170.

Канфэрэнцыі прайшлі пад знакам вялізарнейшай актыўнасьці і згуртаваньня нашага т-ва вакол КП(б)Б, пад знакам барацьбы за генэральную лінію партыі, пад знакам яшчэ большага зпручаваньня сіл на ўзмацненьне абароназдольнасьці краіны Саветаў.

Разам з гэтым мы ў перавыбарчую кампанію маем некаторыя арганізацыі (Райсаветы), якія не змагалі належным чынам скарыстаць дасягненьні «Дэкады абароны» і пасьля яе зараз-жа пераключыцца на справаздачна-перавыбарчую кампанію, на рэалізацыю актыўнасьці працоўных мас па практычным разгортваньні работы і да зьезду падыходзяць без дасягненьняў (Любань, Ветрына і інш.).

Арганізацыя ТДА-Авіяхэму БССР пасьля праведзенага перавучоту налічвае ў 88 раёнах 268 тыс. членаў. Такім чынам па БССР можна сказаць маецца звыш 300 тысяч членаў, што адзначае, рост ад 1-га зьезду да 2-га больш чым у два разы.

Трэба адзначыць, што дзейнасьць Беларускай арганізацыі, як і ўсёй арганізацыі ТДА-Авіяхэму Савецкага Саюзу, праходзіла па двух лініях: 1) па лініі садзейнічаньня ўзмацненьню абароназдольнасьці краіны; 2) па лініі непасрэднага ўдзелу і садзейнічаньня сацыялістычнаму будаўніцтву нашай краіны.

Мы з усёй катэгарычнасьцю адхіляем клусьню фашысцкага друку Польшчы і іншых капіталістычных дзяржаў аб тым, што «Т-ва ТДА-Авіяхэму вялікае таму, што ў Савецкай Рэспубліцы прыналежнасьць да гэтай арганізацыі зьяўляецца абавязковай і ў прымусовым парадку» («Лёт. Польскі») і аб тым, што т-ва ТДА-Авіяхэму толькі займаецца справай вайсковай падрыхтоўкі.

Прыналежнасьць да арганізацыі ТДА-Авіяхэму—ёсьць вынік ня прымусу, а клясавай сьвядомасьці працоўных. Аб гэтым «Лёт. Польскі» маўчыць таксама як ніводным словам не абмовіўся аб рабоце таварыства па садзейнічаньні сац. будаўніцтву. Гэта як і ўсялякая праўда аб СССР нявыгадна фашысцкаму друку.

ТДА-Авіяхэм БССР у галіне садзейнічаньня абароне да 2-га зьезду падыходзіць са значнымі дасягненьнямі, але-ж яны нас ні ў якім разе не павінны здавальняць.

Лічбы ахопу камсамольцаў вельмі нездавальняючыя.

Значна разгарнулася работа ў галіне падрыхтоўкі насельніцтва да паветрана-хемічнай абароны.

Авіяцыйная работа ў т-ве групавалася галоўным чынам вакол камплектаваньня школ ваенна-паветраных сіл, мадэльна-плянэрнай справы і садзейнічаньня самалёта і дырыжабля-будаўніцтву. Набор у школы у некаторых арганізацыях ідзе з перабоямі. Мадэльна-плянэрная справа разгортваецца па школах сярод моладзі.

Удзел у справе самалёта-і дырыжаблябудаўніцтва праз наша таварыства яхэму вялікае таму, што ў Савецкай Рэспубліцы прыналежнасьць да гэтай арганізацыі зьяўляецца абавязковай і ў прымусовым парадку» («Лёт. Польскі») і аб тым, што т-ва ТДА-Авіяхэму толькі займаецца справай вайсковай падрыхтоўкі.

Прыналежнасьць да арганізацыі ТДА-Авіяхэму—ёсьць вынік ня прымусу, а клясавай сьвядомасьці працоўных. Аб гэтым «Лёт. Польскі» маўчыць таксама як ніводным словам не абмовіўся аб рабоце таварыства па садзейнічаньні сац. будаўніцтву. Гэта як і ўсялякая праўда аб СССР нявыгадна фашысцкаму друку.

ТДА-Авіяхэм БССР у галіне садзейнічаньня абароне да 2-га зьезду падыходзіць са значнымі дасягненьнямі, але-ж яны нас ні ў якім разе не павінны здавальняць.

Лічбы ахопу камсамольцаў вельмі нездавальняючыя.

Значна разгарнулася работа ў галіне падрыхтоўкі насельніцтва да паветрана-хемічнай абароны.

Авіяцыйная работа ў т-ве групавалася галоўным чынам вакол камплектаваньня школ ваенна-паветраных сіл, мадэльна-плянэрнай справы і садзейнічаньня самалёта і дырыжабля-будаўніцтву. Набор у школы у некаторых арганізацыях ідзе з перабоямі. Мадэльна-плянэрная справа разгортваецца па школах сярод моладзі.

Удзел у справе самалёта-і дырыжаблябудаўніцтва праз наша таварыства праходзіў па лініі растлумачальнай ролі і задач авіяцыі і паветраплаваньня і па лініі збору сродкаў на іх. Праз нашы арганізацыі без асобных кампаній сабрана і пераведзена сродкаў за пэрыяд 1929-30 гг. каля 120 тысяч рублёў і ў фонд дырыжаблябудаўніцтва каля 23 тысяч рублёў.

Работа ў галіне конкай справы пачала разгортвацца ў апошні год. Зараз некаторыя арганізацыі праз навучальна-страявыя адзінкі праводзяць работу нават з спэцыяльна набытымі коньмі для гэтай мэты. ТДА-Авіяхэму работу па конкай справе перанесла і ў галіну зьберажэньня каня як цягавай сілы і для абароны краіны. Па ініцыятыве конкага сэктару ўзьнята пытаньне праз друк і перад усімі арганізацыямі аб спышэньні масавага забойства коняй. Шмат арганізацый адгукнуліся на гэта і праведзена значная работа.

Работа сярод працоўных жанчын у т-ве значна разгарнулася. Агульны склад жанчын у т-ве на 1-1—31 г. каля 50 тысяч (павялічэньне з 1-X—28 г. на 20 тыс.). Працоўныя жанчыны прымаюць удзел у гуртках вайсковых і стралковых, прычым некаторыя працуюць ужо інструктарамі. На ўсесаюзных спаборніцтвах адна з жанчын стралковай каманды заняла па д-кал. зброі другое месца. 377 жанчын скончылі курсы сувязі, 93 адм.-гасп. службы, 26 чалавек палітасьветныя курсы, 46—падрыхтаваны, як тэхнікі па барацьбе са шкодніжамі с. г. У гуртках процівахэмічнай абароны і камандах заняты звыш 3.500 жанчын. Работа сярод жанчын павінна разгорнуцца ў значна большай меры.

Арганізацыі ТДА-Авіяхэму ўключаліся ў гаспадарча-палітычныя кампаніі, правадзімыя партыяй і савецкай уладай. Мы маем прыклады арганізацыі тда-авіяхэмаўскіх брыгад па ліквідацыі прарываў на прадпрыемствах (Віцебск, Гомельскі раён) па рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка ў чатыры гады», па ўдзеле ў веснавой пасеў-кампаніі.

Паказанае гаворыць за тое, што наша т-ва на фронце мірнага сацыялістычнага будаўніцтва таксама вядзе вялікую работу і сапраўды садзейнічае сацыялістычнаму будаўніцтву.

Матар'яльнае становішча арганізацыі пасьля 1-га зьезду было вельмі дрэннае. Так, напрыклад, агульны бюджэт да 1-га кастрычніка

Рыхтуем рапарт мільёнаў X усебеларускаму зьезду саветаў

РАПАРТ МІЛЬЁНАЎ---РАПАРТ ПЕРАМОГ

у выкананьні плянаў сацыялістычнага будаўніцтва

Сталінцы па-бальшавіцку рыхтуюцца да X усебеларускага зьезду саветаў

Пралетарыі Гомелю ўключыліся ў паход за новыя дасягненьні на фронце выкананьня прамфінпляну да X зьезду саветаў БССР

Бальшавіцкімі тэмпамі

(МЕНСК, ДРУКАРНЯ імя т. СТАЛІНА)

Па ўключэньні ў «рапарт мільёнаў» і прыняцьці на сябе цэлага раду абавязацельстваў, асноўнымі з якіх зьяўляюцца: выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, палепшаньне якасьці і зьніжэньне сабекошту—чым падрыхтаваць X Усебеларускаму зьезду саветаў РАПАРТ ПЕРАМОГ,—друкары-сталінцы за мінулыя 2 тыдні маюць поўнае дасягненьняў.

Машынны цэх, які да прыняцьця абавязацельстваў выканаў прамфінпляна на 81 проц., зараз дабіўся яго выкананьня на 93,3 проц. Пераплётны цэх са 103 проц. зараз дасягнуў 120 проц. Наборны цэх выканаў 87,6 проц. выкананьня прамфінпляну. Літаграфскі—дае 107,8 проц.

Інтэнсыўнасьць працы кожнага рабочага наборнага цэху значна ўзрасла. У пасобку кожным наборшчыкам заданьне перавыконваецца і дасягае да 110 проц. Тое-ж самае і ў другіх цэхах.

Зараз з уключэньнем у «рапарт мільёнаў» друкарня імя т. СТАЛІНА стала на баявыя рэйкі работы. Адчуваецца зрух па ўсіх галінах работы. Мабілізаваны ўсе рабкоры, ударнікі, вылучаны пост-брыгады, ад якіх паступаюць сыгналы ў шматтыражку аб ходзе работы ў цэхах.

ДЛЯ ВЫКАНАНЬНЯ ПУНКТУ АБ ПАЛЕПШАНЬНІ ЯКАСЬЦІ ПРАДУКЦЫІ АБВЕШЧАН ПАХОД ЗА ЯКАСЬЦЬ.

Для выкананьня гэтага пункту спачатку ПАХОДУ наладжан быў у друкарні мітынг, на якім друкары ў прынятай рэзалюцыі адзначылі: дабіцца чаго-б та не каштавала палепшаньня якасьці выпускаемай прадукцыі.

З мэтай уцягненьня большай колькасьці друкароў у справу па палепшаньні якасьці разгорнут па цэхах масавы паход за збор рабочых прапаноў, арганізуецца буксір якасьці. Паміж цэхамі, брыгадамі і камунамі абвешчаны конкурс на лепшую якасьць прадукцыі.

Шматтыражка «ДРУКАРСКАЯ ПРАЎДА» перайшла на штотыднёвае выданьне. У выданым лютаўскім нумары «Друкарскай Праўды» ўзяты асноўны ўпор на барацьбу за якасьць прадукцыі. Апрача гэтага «Друкарская Праўда» арганізавала пераклічку паміж машынным і пераплётным цэхамі і на прад'яўленьне сацыялістычнага рахунку за дрэнную якасьць. Прыступлена да арганізацыі ўдарных брыгад узорнай прадукцыі ў пераплётным і машынным цэхах з перадачай вопыту працы гэтых брыгад у другія цэхі. Адзінаццатага лютага фабзаўком і партколектыў наладжваюць зьлёт ударнікаў па пытаньнях становішча якасьці прадукцыі і стандартызацыі.

Улічваючы вялікае значэньне уключэньня ў «рапарт мільёнаў» фабзаўкомам разам з партколектывам выдадзена да рабочых адозва па палепшаньні якасьці прадукцыі. Намечана рабіць сыстэматычныя налёты сіламі рабкораў «Друкарскай Праўды», групамі «лёгкай кавалерыі» і членамі фабзаўкому ў цэхі для праверкі работы. Мяркуецца сыстэматычна склікаць брыгады, камуны, групы і пасты па пытаньнях ходу і барацьбы за якасьць.

* * *

Пасьля ўключэньня ў «рапарт мільёнаў» прайшло 2 тыдні. За гэты кароткі час друкары-сталінцы маюць рад дасягненьняў, аб чым гаворыць лічбы. Не паслабляючы ўзятых тэмпаў друкары-сталінцы ідуць далей. Да X Усебеларускага зьезду Саветаў яны прыйдуць з вялікімі перамогамі. Сталінцы апраўдаюць ганаровую назву вялікага правадыра, імя якога яны носяць і X зьезду саветаў будуць рапартаваць сваімі перамогамі.

Пад кіраўніцтвам партколектыву друкары з посьпехам выканаюць узятыя на сябе абавязкі. Яны разаб'юць ушчэнт хлусьню правых апартуністаў аб нерэальнасьці ўзятых тэмпаў.

ШЭМПЕЛЬ.

„Палесдрук" да зьезду саветаў

Выклік сталінцаў прыняты

ГОМЕЛЬ, 7-II. (Наш. кар.). Фабком «Палесдруку» прыняў выклік друкарні імя «Сталіна» аб уключэньні ў «рапарт мільёнаў» і вынес наступную пастанову:

«Уся падрыхтоўчая работа па складаньні рапартаў да X-га Усебеларускага і VI Усесаюзнага зьезду Саветаў навінна прайсьці пад знакам замацаваньня ўсіх дасягненьняў асобнага кварталу, выкананьня сустрэчнага пляну 3-га рашаючага году пяцігодкі па ўсіх паказьніках у напрамку бальшавіцкага правядзеньня месячніка рацыяналізацыі і палепшаньня якасьці прадукцыі, зборы і выкананьні рабочых прапаноў, а таксама шырокага разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва сярод рабочых мас і арганізацыі праверкі выкананьня дырэктыў. Канкрэтныя абавязацельствы сплаціць у бліжэйшы час на аснове прапаноў ударнікаў цэхаў і брыгад».

Распачаў сваю працу VI зьезд саветаў Полаччыны

ПОЛАЦАК, 7-II. (Наш. кар.). 5 лютага распачаў сваю працу шосты зьезд Саветаў Полацкага раёну. Зьявілася на зьезд звыш 300 дэлегатаў. Адчыненьне зьезду Саветаў ператварылася ў агульнае сьвята гораду, у дэманстрацыю шчырэйшага згуртаваньня вакол бальшавіцкай партыі прапоўных мас, на барацьбу за пасьпяховае выкананьне задач 3 рашаючага году пяцігодкі. У ганаровы прэзыдыум зьезду пад бурныя воплескі абраны: т.т. Сталін, Молатаў, Калінін, Варашылаў, Гей, Галадзед, Шаранговіч, Тэльман і Ленскі.

У час першага пасяджэньня зьезду былі заслуханы рапарты Полацкага чыгуначнага вузла, гуты «Праца», Н-скай ударнай стралковай дывізіі, Н-скага надшэфнага стралковага палка, калгасу «Перамога» і цэлага раду прадпрыемстваў гораду. Віталі зьезд дэлегацыі партыйных, прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый. Зьезд паслаў прывітальныя тэлеграмы: т.т. Сталіну, Молатаву, ЦК КП(б)Б і ЦВК БССР.

З вялікім дакладам аб дзейнасьці ўрада БССР выступіў старшыня ВСНГ БССР т. Грысевіч. Дакладчык у паўтарагадзінным прамове, ахарактэрызаваў міжнароднае становішча, застанавіўшыся на дасягненьнях і далейшых перспэктывах сацыялістычнага разьвіцця Савецкай Беларусі. Заслухана зьедам і справаздача Полацкага РВК. У спрэчках па абоих дакладах натлядалася надзвычайна вялікая актыўнасьць дэлегатаў. Спрэчкі праходзяць пад пунктам гледжаньня перабудовы работы саветаў тварам да калектывізацыі, да найхутчэйшага і найлепшага выкананьня палітычна-гаспадарчых задач, пастаўленых партыяй перад Раёнам.

6 лютага зьезд вітаў вялікі чырвоны абоз з хлебам. У чырвоным абозе ўдзельнічала каля 70 падвод.

Баз. Румянец.

Поўным выкананьнем плянаў лёназагатовак спаткаем X Усебеларускі зьезд саветаў

Усебеларускі чырвоны абоз з лёнам—лепшы падарунак X зьезду саветаў БССР

Пераключыцца на баявыя тэмпы, ня траціць ніводнага дню на разважаньні, з усёй бальшавіцкай настойлівасьцю, упартасьцю і рашучасьцю выканаць баявы загад партыі і ўраду. Лён не павінен заставацца, асядаць у вёсцы, а для гэтага партыйныя і савецкія органы павінны з яшчэ большай рашучасьцю, з яшчэ большым бальшавіцкім напорам арганізаваць калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкія масы сялянства на выкананьне пляну лёназагатовак, узьняць актыўнасьць мас, поўнасьцю выявіць кулацкія і заможныя гаспадаркі, якія затрымліваюць лён, якія зрываюць своечасовую яго здачу, прымусіць кулака выканаць цьвёрдыя заданьні.

Учора адбылася нарада чацьвёрні ЦК і Саўнаркому БССР па пытаньні лёназагатовак. На гэтай нарадзе намечан рад канкрэтных мерапрыемстваў па выкананьні поўнасьцю пляну лёназагатовак. У двухдзённім штурму партыйныя і савецкія арганізацыі павінны паставіць справу так, каб лёназагатоўчая кампанія ня толькі была поўнасьцю выканана за гэты тэрмін, але і значна перавыканана. У кампанію выкананьня лёназагатовак павінна быць разгорнута ва ўсю шырыню і велічыню сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва. Калгасьнікі павінны быць прыкладнымі перадавымі ўдатчыкамі лёна-семя. Калгасьнікі павінны пацягнуць за сабой бядняцка-серадняцкія масы, мабілізаваць грамадзкую думку вакол лёназагатовак так, каб кожны партыйны, савецкі работнік кожны калгасьнік ведаў, што гэта зьяўляецца важнейшай палітычна-гаспадарчай кампаніяй.

На нарадзе адзначана што тыя раёны якія поўнасьцю выканаюць у найкарацейшы тэрмін лёназагатоўкі, будуць прэміраваны аўтамашынамі і прамтаварамі. Ні хвіліны ня траціць часу, па-бальшавіцку, занасаўшы рукавы, за работу па выкананьні лёна-загатовак. Арганізуем чырвоны Усебеларускі абоз—падарунак X зьезду Саветаў БССР!

12 лютага, а 6 гадзіне ўвечары ў залі пас джэньняў Гаркому КП(б)Б (вул. Энгельса, 28) склікаецца

ПЛЕНУМ МЕНГАРКОМУ КП(б)Б

з парадкам дня:

1) Аб падрыхтоўцы да веснавой сяўбы і далейшых задачах у галіне калектывізацыі па прыгарадным раёне з дакладам аб падрыхтоўцы да веснавой сяўбы па прыгарадных гаспадарках МаРК (дакл. т. т. Аксючыц і Кумкес).

2) Аб падрыхтоўцы да будаўнічага сэзону 1931 г. (дак. т. Гольдберг).

3) Вынікі партасьветы з 1 паўгодзьдзе (дакл. т. Пя ушкоў).

Апрача членаў і канды атаў Гаркому КПБ, рэўкамісіі Гаркому КПБ, на пленум выклікаюцца: па першым пытаньні—сэкратары вясковых партячэек, старшыні сельсаветаў, калгасаў і кіраўнікі саўгасаў (камуністы); па другім пытаньні—сэкратары партколектываў і кіраўнікі будаўнічых арганізацый (камуністы); па трэцім пытаньні—прапагандысты партшко.

Гарком КП(б)Б

Выклік рабочых швэйнай фабрыкі „Кастрычнік"—„камінтэрнаўцы" прынялі

ГОМЕЛЬ, 7-II. (Наш. кар.). Пленум фабкому швэйнай фабрыкі «Камінтэрн» прыняў выклік швэйнай фабрыкі «Кастрычнік» і ўключыўся ў «рапарт мільёнаў» X Усебеларускаму і 6 Усесаюзнаму зьезду Саветаў. Канкрэтна вызначаны наступныя абавязацельствы, па якім фабрыка будзе рапартаваць зьездам:

1. Ліквідаваць прарыў, які маецца ў выкананьні прамфінпляну за студзень месяц у суконных цэхах.

2. Забясьпечыць 100-проц. ўдзел рабочых у перавыбарах Гарсавету, даўшы ў Гарсавет дэпутатамі лепшых ударнікаў фабрыкі.

3. Да адчыненьня зьезду выканаць 100-процантнае заданьне самавіка.

4. Палепшыць якасьць прадукцыі, вылучыўшы для гэтага спэцыяльную брыгаду па якасьці і арганізаваўшы масавы кантроль над якасьцю выпусканай прадукцыі.

5. Уцягнуць новых ударнікаў у брыгады імя X Усебеларускага зьезду Саветаў.

6. Дабіцца зьніжэньня пратулаў і спазьненьняў, шляхам жорсткай барацьбы з пратульшчыкамі.

7. Не пазьней 10-га лютага закончыць кампанію па самаабмацаваньні рабочых за фабрыкай да канца пяцігодкі, ахапіўшы ёй 100 проц. рабочых.

8. Арганізаваць праверку выкананьня рабочых прапаноў.

9. Ахапіць усіх рабочых падпіскай на пазыку «Пяцігодка—у чатыры гады».

10. Выканаць кантрольныя лічбы па фабрычнай касе апчадкасьці.

11. Даручыць цэхкамітэтам рэдкалегіі шматтыражкі і ільлічоўкі ўстаматальныя тэлеграмы: т.т. Сталіну, Молатаву, ЦК КП(б)Б і ЦВК БССР.

12. Выканаць дырэктывы партыі ў правядзеньні другой бальшавіцкай вясны для чаго разгарнуць масавую работу, арганізаваўшы рабочыя рамонтныя брыгады для пасылкі ў падшэфныя калгасы і замацаваць сувязь з 25.000.

13. Узмацніць шэфства над саўапаратам, уцягнуўшы ў гэту працу шырокі актыў ф-кі. З боку камсамольскага актыву арганізаваць ударную брыгаду імя X Усебеларускага зьезду Саветаў для ліквідацыі завалаў-пауфабрыкатаў.

14. Ажывіць работу брыгады «прыхільнікаў машын» і арганізаваць такія брыгады ва ўсіх цэхах.

15. Уцягнуць ва ўдарныя брыгады і ў сацспаборніцтва моладзь фабрыкі, яшчэ неахопленай сацспаборніцтвам.

16. Мабілізаваць увагу камсамольцаў і ўсіх рабочых на ўдарнага памазьніка цэху моладзі і дабіцца выкананьня ўзятых на сябе абавязкаў па выкананьні прамфінпляну і зьніжэньні сабекошту.

17. Усю моладзь і камсамольцаў ахапіць вучобай і падпіскай на газэты.

18. Дабіцца ў бліжэйшы час выкананьня дырэктывы пастаноў зьезду ЛКСМБ і выканаць лёзунг аб 100 проц. уцягненьні рабочай моладзі ў камсамол.

Адначасова прынята пастанова аб выклику па ўключэньні ў «рапарт мільёнаў»—заводаў «Пралетары» і «Праца» (Гомель).

Пры вялікім уздыме мас

Раённы зьезд саветаў Глускага раёну адчыніўся 30-га студзеня. На зьезьдзе ўдзельнічала каля 150 дэлегатаў, абраных на зьезд на сельсаветах.

Райзьезд Саветаў віталі шматлікія дэлегацыі калгасьнікаў, саўгасьнікаў, членаў прафсаюзаў і камсамолу.

За час працы райзьезду арганізавана ў гонар зьезду 9 новых калгасаў, што павысіла на 2 проц. калгаснае будаўніцтва ў раёне. У падарунак зьезду чырвонымі абозамі калгасьнікаў з удзелам беднаты і серадняку акаляючых вёсак здадзена каля 50 тон збожжа, 10 адкормленых сьвіней.

Зьезд праходзіў пры вялікім уздыме актыўнасьці дэлегатаў і жорсткай пралетарскай крытыкі і самакрытыкі ўсіх недахопаў у працы цэнтральных і раённых устаноў.

Па дакладу ўраду выказалася каля 18 чал. Прамоўцы адзначалі вялікія дасягненьні і посьпехі партыі і ўраду ў сацыялістычным будаўніцтве. Зьезд Саветаў Глускага раёну цалкам і поўнасьцю прызнаў палітычную лінію ўраду БССР правільнай і работу здавальняючай.

Палітычная актыўнасьць на райзьезьдзе адчувалася, як ніколі. Глушчына на самой справе ў перыяд зьезду адчувала вялікае сьвята, на якім працоўныя масы ўсіх нацыянальнасьцяй паказалі сваю згуртаванасьць, вакол усіх мерапрыемстваў камуністычнай партыі і ўраду па пабудове сацыялізму. Усе дэлегацыі ў сваіх прывітаньнях цьвёрда заверылі ўрад, што калгасьнікі, саўгасьнікі і бядняцка серадняцкія масы вёскі яшчэ больш напружаць свае сілы і энэргію на выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады, на выкананьне задач трэцяга рашаючага году пяцігодкі, а таксама на выкананьне ўсіх палітычна-гаспадарчых кампаній, асабліва на правядзеньне другой бальшавіцкай калгаснай вясны.

Шматлікія прывітаньні і рапарты рабочых саўгасаў і калгасьнікаў яшчэ раз з усёй рашучасьцю падкрэсьліваюць правільнасьць правядзеньня генэральнай лініі Ленінскай камуністычнай партыі і яе Ленінскага бальшавіцкага ЦК КП(б)Б у правядзеньні жорсткай барацьбы з усякімі ўхіламі ад генэральнай лініі партыі, у барацьбе з правым апартунізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, так і «левымі» загібамі і г. д.

Раённы зьезд Саветаў Глушчыны праходзіў пад знакам новае хвалі прыліву ў калгасы бядняцка-серадняцкіх мас вёскі і арганізацыі новых калгасаў. пад знакам баявой матушнасьці і выкананьня пяцігодкі ў чатыры гады і задач 3-га рашаючага году пяцігодкі, пад знакам рашучага правядзеньня другой бальшавіцкай калгаснай вясны і чоткага правядзеньня клясавай лініі партыі ва ўсёй рабоце і агульным наступам на рэшткі капіталістычных элемэнтаў—кулака на вёсцы, непмана—у горадзе.

Зьезд паслаў прывітальныя тэлеграмы ЦК УсеКП(б), ЦК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР і тав. Варашылаву.

Адзінцоў.

Узяць бальшавіцкія тэмпы!

Загатоўка і ачыстка насеньня, рамонт інвэнтара—адсталыя вучасткі ў падрыхтоўцы да сяўбы

„Пленум ЦК абавязвае ўсе партарганізацыі ўзяць пад свой непасрэдны нагляд ход загатовак насеньня траў і гародных культур з тым, каб забясьпечыць выкананьне плянаў у намечаны тэрмін"...

(З пастановы студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б).

Разгарнуць работу па арганізацыі новага калгаснага прыліву

Пастанова

Савету Народных Камісараў БССР

ПРА ХОД ПАДРЫХТОЎКІ ДА ВЯСНОВАЙ ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ.

Выслухаўшы інфармацыю Нам. Упаўнаважанага СНК тав. Масюкова пра ход падрыхтоўкі да веснавой пасеўнай кампаніі, Савет Народных Камісараў БССР адзначае, што:

а) раённыя выканаўчыя камітэты і калгасная сыстэма да гэтага часу дастаткова не разгарнулі свае працы для арганізацыі новага прыліву ў калгасы і кіраўніцтва гэтым прылівам, чым не забясьпечваюць выкананьня дырэктыў партыі і Ураду ў галіне калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак;

б) загатоўкі насеньня ідуць недапушчальна слаба і раённыя арганізацыі за гэтае важнейшае мерапрыемства пасеўнай кампаніі не эварочваюць належнае ўвагі;

в) зусім слаба выконваюцца дырэктывы па рамонту сельскагаспадарчага інвэнтара;

г) зусім не разгорнуты сацыялістычныя мэтады працы—сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж пасобнымі калгасамі і саўгасамі, а таксама паміж пасобнымі калгасьнікамі і рабочымі саўгасаў, не мабілізаваны вакол гэтага бядняцка-серадняцкія масы сялянства;

Бяручы пад увагу паказанае вышэй, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Даручыць Народнаму Камісарыяту Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі неадкладна выслухаць даклады пасобных арганізацый аб іх працы па падрыхтоўцы да веснавой пасеўнай кампаніі і вінаватых у невыкананьні дырэктыў Ураду прыцягнуць да суровай адказнасьці.

2. Паказаць Старадарожскаму, Копыльскаму, Быхаўскаму, Дрысенскаму Касьцюковіцкаму, Крупскаму і Смаляўцкаму раённым выканаўчым камітэтам на недапушчальнасьць зьніжэньня пляну вясеньняга пасеву, зацьверджанага СНК і абавязаць іх на працягу пяці дзён аднавіць гэтыя пляны і тэлетрафна паведаміць аб гэтым СНК.

3. Абавязаць сельскагаспадарчыя трэсты, калгасна-каапэрацыйную сыстэму і раённыя выканаўчыя камітэты забясьпечыць выкананьне пастановы СНК за 3 сьнежня 1930 г. «Аб веснавой пасеўнай кампаніі 1931 г.» у частцы разгортваньня сацспаборніцтва паміж саўгасамі ,калгасамі і вёскамі, а таксама паміж пасобнымі раёнамі па правядзеньні вясьненняй пасеўнай кампаніі.

4. Лічыць патрэбным павялічыць процант калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у раёнах дзейнасьці машынна-трактарных станцый.

5. Даручыць Белкалгасцэнтру ўзмацнічць працу для арганізацыі і своечасовага афармленьня новых калгасаў, не спыняючыся перад афармленьнем новых калгасаў нават з невялікай колькасьці бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

6. Абавязаць Народны Камісарыят Земляробства пры завозе сельска-гаспадарчых машын, асабліва складаных, улічваць спэцыялізацыю кожнага раёну і ўжыць захады для абслугоўваньня гэтых машын мэханізаванай і цягавай сілай.

7. Абавязаць сельскагаспадарчыя трэсты і калгасна-каапэрацыйную сыстэму на працягу 3-х дзнаў забраць усю вапну, якая прызначана для веснавой пасеўнай кампаніі.

8. Для забясьпечаньня мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў і своечасовага завозу сельскагаспадарчых машын, абавязаць калгасна - каапэрацыйную сыстэму і саўгасы забіраць машыны зараз-жа пасьля іх паступленьня на склады.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР Л. Дубавіцкі.

3 лютага 1931 г.

г. Менск.

Раёны слаба рыхтуюцца да сяўбы

(На нарадзе старшынь і аграномаў сьвінаводных раёнаў

На вечэрнім пасяджэньні 8 лютага працягваліся спрэчкі па дакладу тав. Лацыса.

Тав. Грышчанка (Шклоўскі раён) кажа, што на льнязавод часта здаюць неабмалочаны лён, у выніку чаго глуміцца добрае семя. На льнязаводзе існуюць непаразьдзі. Спэцыялісты па прыёмцы сыромы лёну недабрасумленна адносяцца да сваіх абавязкаў.

— Да апошняга часу,—кажа т. Пыжыкаў (Белільнасаюз) раёны вельмі слаба рыхтуюцца да сяўбы. Ачыстка насеньня праводзіцца дрэнна; на 1-й далі зьвесткі аб ходзе вярнаечыпчаньня толькі 14 раёнаў. Нічога ня робіцца па стварэньні насенных і страхавых фондаў.

Тав. Шаўкуноў (Белільнасаюз) спынаецца на тым, што раёны не своечасова ня выканалі дагавару па забясьпечаньні школ падручнікамі і сшыткамі. Райвыканком з-за адсутнасьці гатоўкі крыху затрымаў аплату рахунку, а спажывецкае таварыства спыніла выдачу школам кніг і сшыткаў. Прадавец кнігарні т. Балоцін нават ня падначаліўся распараджэньню старшыні праўленьня каапэрацыі і прыехаўшым за падручнікамі настаўнікам прышлося дарэмна страціць час і сродкі на фурманку. Настаўнікі ў час канфэрэнцыі рэзка крытыкавалі такую дзейнасьць каапэрацыі.

У час правядзеньня настаўніцкай канфэрэнцыі было абгаворана пытаньне аб правядзеньні дэкады штурму па ліквідацыі прарываў на фронце ўсеагульнага навучаньня і ліквідацыі няпісьменнасьці. Настаўнікі абвясьцілі сябе ўдарнікамі, а частка іх падала заявы аб замацаваньні за школамі да канца пяцігодкі.

Адначасова канфэрэнцыя настаўнікаў Крычаўскага раёну рашыла актыўна ўключыцца ў правядзеньне дэкады штурму і выклікала на сацспаборніцтва асьветнікаў Чэрыкаўскага раёну на лепшы ўдзел у штурме.

УДАРНІК.

Пагражаючы сыгнал з Магілеўшчыны

Райза і Райкалгассаюз сядзяць, склаўшы рукі

(Ад нашага Магілеўскага карэспандэнта).

Выкананьне галоўнейшых мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да сяўбы на Магілеўшчыне зрываецца. Плягы да большасьці сельсаветаў не даведены. Рамонт машын і інвэнтара не праводзіцца. Да гэтага часу ня выяўлена ліпчэ, які інвэнтар патрабуе рамонту. Нічога ня ведае ні райкалгассаюз ні Райза, што зроблена па зборы насеньня і стварэньні страхавых фондаў, ачыстцы насеньня, складаньні фуражнага фонду, зборы попелу. Загатоўка насенных матар'ялаў зрываецца. У Чырвонапольскім, Дасовіцкім, Гарадскім і інш. сельсаветах пляны сяўбы не абгаворыны на прэзыдыуме сельсаветаў, але да двара не даведены.

Саюзныя арганізацыі, у прыватнасьці, Райпрафсавет, падрыхтоўкай да веснавой сяўбы ня цікавяцца. Рабочыя масы гораду не мабілізаваны на дапамогу ў падрыхтоўцы да сяўбы.

А. Нёманскі.

АБ ГЭТЫМ ПРЫКЛАДЗЕ ПАВІННА ВЕДАЦЬ УСЯ БЕЛАРУСЬ

26 лютага—дзень праверкі саўдагавору паміж калгасамі „Гігант" і імя Варашылава

Калгасы «Гігант» і імя Варашылава, Полацкага раёна заключылі паміж сабою сацыялістычны дагавор на лепшую падрыхтоўку да бальшавіцкай сяўбы. Дагавор прадугледжвае 100 проц. засыпку насенфондаў, ачыстку насеньня, ударны рамонт сельска-гаспадарчага інвэнтара, складаньне страхавых насенфондаў, збор попелу і стварэньне спэцыяльнай кармовай базы для забясьпячэньня кармамі гужавой сілы на час веснавой сяўбы.

У дагаворы маецца адзін надзвычай цінавы момант: на 26-га лютага вызначаны так званы «пробны выезд ў поле», гэта значыць будзе праведзена праверка выкананьня соцдагавору. Гэта праверка пакажа на колькі бакі сацыялістычнага дагавору выконваюць узятыя на сябе абавязкі.

Заключыўшы такую ўмову абудва калгасы сапраўды ўзяліся за ўдарную падрыхтоўку да сяўбы. Наторы з калгасаў будзе «біты» аб гэтым пакажа праверка—зараз-жа ідзе ўдарная падрыхтоўка да 26-га лютага.

Гэты прыклад двух калгасаў варта перанінуць і ў другія калгасы БССР. Разгорнутае сацыялістычнае спаборніцтва паміж калгасамі «Гігант» і імя Варашылава забясьпечыць ударнае правядзеньне другой бальшавіцкай вясны.

БАЗ. РУМЯНЕЦ.

Пытаньні культурнай рэвалюцыі

Працягнуць дэкаду штурму да X усебеларускага зьезду саветаў

Дабіцца поўнага выкананьня плянаў ліквідацыі няпісьменнасьці і усеагульнага навучаньня

Асьветнікі! Яшчэ больш рашуча выкрывайце і змагайцеся з правымі і „левымі" апартуністамі, з вялікадзяржаўным шавінізмам, контррэвалюцыйным беларускім нацдэмакратызмам і з шавінізмамі іншых колераў

Рапартаваць X Усебеларускаму зьезду саветаў

поўным выкананьнем плянаў усеагульнага навучаньня і ліквідацыі няпісьменнасьці

XVI зьезд партыі зусім правільна выпрарывы ў выкананьні плянаў ліквідацыі няпісьменнасьці і ўсеагульнага навучаньня. Матар'ялы, імя сёньня мы зьмяшчаем, сьведчаць аб тым, што па некаторых раёнах яшчэ няма належнага пералому. Тэлеграма са Шклову гаворыць аб тым, што апартуністы фабрычных арганізацый фабрыкі «Спартак» не заўважылі ў сябе 150 няпісьменных рабочых і не арганізавалі для іх ліквпункту. Настаўніцкія канфэрэнцыі, якія зараз адбываюцца ў БССР, таксама сьцьвярджаюць аб дрэннай рабоце ліквпунктаў, аб значным недавыкананьні плянаў ліквідацыі няпісьменнасьці і ўсеагульнага абавязковага навучаньня.

Усё гэта прымушае рабіць вывад, што дэкада штурму ў шмат якіх раёнах не знайшла належнага пераламленьня. Мясцовыя арганізацыі ня здолелі яшчэ належным чынам узьняць працоўныя масы на штурм прарываў на фронце культурнага будаўніцтва.

Трэба дэкаду штурму прарываў на фронце культурнага будаўніцтва працягнуць з такім разьлікам, каб у дзень адчыненьня X Усебеларускага зьезду саветаў адрапартаваць гаспадару Савецкай Беларусі поўным выкананьнем плянаў усеагульнага навучаньня і ліквідацыі няпісьменнасьці.

Да X Усебеларускага зьезду саветаў ніводнага няпісьменнага, падлягаючага навучаньню, па-заліквпунктам, ніводнага дзіцяці школьнага ўзросту, не ахопленага школай.

Сельсавет ня цікавіцца

ліквідацыяй няпісьменнасьці

Ліквідацыя няпісьменнасьці ў в. Дубей Чырвона-Дароскага сельсавету (Старобінскі раён) зрываецца. Агітацыйна растлумачальная работы ніякай не праводзіцца, няпісьменная моладзь замест наведваньня ліквпункту, спраўляе вечарынкі. Камсамольская ячэйка не рэагуе на гэта. Сярод камсамольцаў маюцца малапісьменныя, але наведваюць заняткі на ліквпунце ўсяго два.

Трэніч.

Далі рашучы адпор шавіністым

У апошніх дніх студзеня ў м. Нароўлі адбылася раённая канфэрэнцыя настаўнікаў.

Асноўным пытаньнем на канфэрэнцыі было пытаньне аб веснавой пасеўнай кампаніі. У спрэчках па гэтым пытаньні выказалася 27 асьветнікаў. Усе яны адзначылі важнасьць пасьпяховага правядзеньня другой бальшавіцкай сяўбы, неабходнасьць барацьбы за пашырэньне калектывізацыі. Настаўнікі заявілі, што яны будуць рашуча змагацца з клясавым ворагам-кулаком, які ўвесь час імкнецца перашкаджаць правядзеньню калектывізацыі.

Выступіўшаму на канфэрэнцыі загадчыку Акопскай украінскай школы калгаснай моладзі т. Дзядкоўскаму, які пачаў гаварыць, што пляны пасеўнай кампаніі не рэальны, канфэрэнцыя дала рашучы адпор.

Шмат недарэчнасьцяй выкрыта на канфэрэнцыі і ў рабоце школ і ліквпунктаў. Канфэрэнцыя вырыла і дала рашучы адпор вылазкам шавініста загадчыка Галоўчыцкай польскай ШКМ т. Красінскага і настаўніка Нараўлянскай яўрэйскай сямігодкі т. Рэзьніка.

На канфэрэнцыі высьветлілася, што настаўнікі Аляксандраўскай польскай школы замест таго, каб на новы год праводзіць заняткі ў школе, паехалі па гасьцях і антырэлігійнай работы ў анты-калядную кампанію не праводзілі.

Большасьць ліквпунктаў працуе слаба. Больш-менш здавальняюча ідзе работа на ліквпунктах пры школах, на якіх працуюць настаўнікі ў парадку грамадзкай нагрузкі. На лепш стаіць справа і з палітэхнізацыяй школ. Ніводзін настаўнік да гэтага часу ня ўдзяміў яшчэ добра сутнасьць палітэхнізацыі, ня ведае з чаго пачаць і як праводзіць палітэхнізм у школе.

Канфэрэнцыя вынесла цэлы рад канкрэтных пастаноў для зьяшчэньня ўсіх прарываў на культурным фронце.

Асьветнік.

Наш адказ

беларускім контр-рэвалюцыйным нацдэмакратам

Настаўніцкая канфэрэнцыя Бярэзінскага раёну ў адказ на вылазкі контррэвалюцыянэраў — беларускіх нацдэмаў—агентаў польскага фашызму аднагалосна заявіла:

Мы, асьветнікі Бярэзінскага раёну, будзем у сваёй штодзённай рабоце весьці самую рашучую барацьбу супроць вялікадзяржаўнага шавінізму—галоўнай небясьпекі на даным этапе, з праявамі контррэвалюцыйнага беларускага нацдэмакратызму і з шавінізмамі іншых колераў.

Для ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны, выкананьня 5-цігодкі за 4 гады, асьветнікі Бярэзінскага раёну ўзялі на сябе абавязак у дэкадны тэрмін распаўсюдзіць сярод сялянства аблігацый пазыкі «Пяцігодка за чатыры гады» на 1000 руб.

Рыбкоўскі

Ганебны прарыў

(ПА ТЭЛЕГРАФУ АД НАШАГА КАРЭСПАНДЭНТА).

ШКЛОЎ, 9-II. На Шклоўскай паняровай фабрыцы «Спартак» налічваецца 150 чалавек няпісьменных і малапісьменных, што складае 20 проц. агульнай колькасьці рабочых фабрыкі.

Фабрычныя арганізацыі праяўляюць апартуністычныя адносіны да справы ліквідацыі няпісьменнасьці. Не зважаючы на такую вялікую колькасьць няпісьменных, на фабрыцы няма ліквпунктаў. Больш таго, апартуністы з фабкому недзе згубілі сьпісы няпісьменных. Шампур.

Бюракраты з Крычаўскай каапэрацыі

зрываюць усеагульнае навучаньне

Усеагульнае навучаньне, ліквідацыя няпісьменнасьці і палітэхнізацыя школ зьяўляюцца важнейшымі вучасткамі культурнай рэвалюцыі.

Што-ж мы маем на гэтым фронце ў Крычаўскім раёне?

Ліквпунктамі на раёне ахоплена толькі 69 проц. агульнай колькасьці няпісьменных, што зьяўляецца далёка недастатковым. Мае раён посьпехі ў галіне ўсеагульнага навучаньня — школамі ахоплена 98,8 проц. усёй колькасьці дзяцей школьнага ўзросту

Палітэхнізацыя, асабліва ў пачатковых школах, да гэтага часу амаль разрушылася з месца. Не разгорнута работа і па арганізацыі гарачых сьнеданьняў у школах.

Кнігарня Крычаўскай спажывецкай каапэрацыі ня выканала дагавару па забясьпечаньні школ падручнікамі і сшыткамі. Райвыканком з-за адсутнасьці гатоўкі крыху затрымаў аплату рахунку, а спажывецкае таварыства спыніла выдачу школам кніг і сшыткаў. Прадавец кнігарні т. Балоцін нават ня падначаліўся распараджэньню старшыні праўленьня каапэрацыі і прыехаўшым за падручнікамі настаўнікам прышлося дарэмна страціць час і сродкі на фурманку. Настаўнікі ў час канфэрэнцыі рэзка крытыкавалі такую дзейнасьць каапэрацыі.

У час правядзеньня настаўніцкай канфэрэнцыі было абгаворана пытаньне аб правядзеньні дэкады штурму па ліквідацыі прарываў на фронце ўсеагульнага навучаньня і ліквідацыі няпісьменнасьці. Настаўнікі абвясьцілі сябе ўдарнікамі, а частка іх падала заявы аб замацаваньні за школамі да канца пяцігодкі.

Адначасова канфэрэнцыя настаўнікаў Крычаўскага раёну рашыла актыўна ўключыцца ў правядзеньне дэкады штурму і выклікала на сацспаборніцтва асьветнікаў Чэрыкаўскага раёну на лепшы ўдзел у штурме.

УДАРНІК.

Дзесяцігодзьдзе АБВШ імя ЦВК БССР

„Нападу на нас мы абавязаны супроцьпаставіць нашу жалезную, высока-абучаную, палітычна-ўстойлівую, добра ўзброеную бальшавіцкую армію... Асабліва востра паставіць у даны момант пытаньне аб выдзяленьні з свайго асяродку і адпаведнай падрыхтоўцы патрэбных нам ваенна-тэхнічных кадраў

(ВАРАШЫЛАЎ)

Лепшых ударн'каў з рабочай моладзі---у ваенныя навучальныя ўстановы

ДЗЕСЯЦЬ ГОД БАРАЦЬБЫ

Артыкул начальніка і ваенкома АБВШ т. Васілевіча

Наша Чырвоная Армія ёсьць перш за ўсё, узброеная сіла для хутчэйшага зрыдушэньня эксплёататараў, для завесьпячэньня будаўніцтва сацыялізму, для абароны бацькаўшчыны сусьветнага пралетарыяту. Але ж задачы Чырвонай Арміі тэтым не вычэрпваюцца. Наша армія ня ёсьць армія працоўных адтэй толькі краіны, як і справа сацыялістычнага будаўніцтва СССР не зьяўляецца толькі справай працоўных СССР. Сацыялістычнае будаўніцтва ў СССР зьяўляецца ўтварэньнем матар'яльнай ды іншых баз сусьветнай комуністычнай рэвалюцыі, а Чырвоная Армія ёсьць армія гэтай рэвалюцыі.

СССР ня ёсьць дзяржава адной якой-небудзь нацыянальнасьці, а ёсьць Саюз працоўных розных нацыянальнасьцей. Натуральна пабудаванне Чырвонай Арміі, якая зьяўляецца адной з форм саюзу працоўных розных нацыянальнасьцей, павінна адпавядаць прыродзе і задачам Саюзу ССР.

XII зьезд Комуністычнай партыі даючы канкрэтныя дырэктывы на ўтварэньні ССР не абмінуў і пытаньне будаўніцтва баявой сілы Саюзу. Зьезд даў дырэктыву партыі, каб «Была ўмацована выхаваўчая работа Чырвонай Арміі ў духу пасяджэньня ідэй брацтва і салідарнасьці народаў Саюзу, і былі ўжыты практычныя мерапрыемствы па арганізацыі нацыянальных вайсковых часьцей, з захаваньнем усіх мер, неабходных для забясьпечэньня поўнай абароназдольнасьці Рэспублікі». Гэта значыць, што неабходна прыцягнуць для абароны краіны працоўных усіх нацый.

Канкрэтнай формай гэтага зьяўляецца фармаваньне нацыянальных часьцей Чырвонай Арміі. Нацыянальныя фармаваньні па сутнасьці сваёй і значэньні, што працоўныя ўсіх нацыянальнасьцей прыцягнуты да справы абароны сацыялістычнай бацькаўшчыны. На цыянальныя фармаваньні лішні раз да ведаць, што Чырвоная Армія неадлучальна ад працоўных мас, лішні раз даводзіць не інтэрнацыянальны зьмест. А ўсё гэта ў сваю чаргу аказвае дадатковую сілу Чырвонай Арміі і пралетарыяту.

У першыя дні рэвалюцыі ня было магчымасьці прыступіць да фармаваньня нацыянальных часьцей таму, што для гэтага ня было адпаведных умоў. У працэсе грамадзянскай вайны стыхійна ўзьнікалі асобныя атрады нацыянальных войск, якія вярэдка называлі ўзоры тэрызму.

Роснасьць гаспадарчага і культурнага ўзроўню народаў Саюзу ССР, адсутнасьць у пэрэду народаў СССР вайсковай падрыхтоўкі ў мінулым, адсутнасьць камандзнага нацыянальнага складу не дазваляді асабліва шырока рухацца па шляху утварэньня нацыянальных часьцей і ў першыя гады мірнага будаўніцтва Чырвонай Арміі.

Пасьляховае вырашэньне нацыянальнага пытаньня на аснове правільнай Ленінскай нацыянальнай палітыкі партыі, гаспадарчы і культурны рост народаў СССР, якія ў мінулым знаходзіліся пад падвойным прэсам сацыяльнага прыгнечаньня, зьяўленьне фактычнай вяроўнасьці працоўных розных нацыянальнасьцей СССР—зьявілася базай для утварэньня нацыянальных часьцей, для далейшага ўзмацненьня абароназдольнасьці СССР. Нацыянальныя фармаваньні—ёсьць неадлучная частка нацыянальнай палітыкі партыі. «Толькі на ўмовах поўнай нацыянальнай роўнасьці і нацыянальнай палітыкі Савецкага ўраду стала магчымым ажыцьцявіць невярэшымае для парызму і для капіталістычных краін пытаньне аб прыцягненьні ўсіх народаў да будаўніцтва ўзброеных сіл краіны» (Варашылаў).

Беларусія—краіна, насьпешчаная якой у сваім мінулым прыцягвалася да вайсковай службы, а рэвалюцыя і грамадзянская вайна ўтварыла, хоць і колькасна нешчаныя кадры камандзнага і палітычнага складу. Аднак, для ўтварэньня беларускіх часьцей гэтага складу было мала, ды пры тым ён ў большасьці сваёй быў русіфікаваны. Адсюль з тэхнічнасьцю вынікла вынікчай важнасьці задача: утварэньне новых кадраў камандна-палітычнага складу з рабочых і бядняцкіх мас карэннага насельніцтва.

Шляхі практычнага вырашэньня гэтай вышэйшай задачы знойдзены ва ўтварэньні вайсковых школ.

АБВШ вырасла з кароткатэрміновых курсаў па падрыхтоўцы камандзнага складу. Рэарганізацыя курсаў у школу, рост і посьпехі АБВШ адбіваюць рост баявой магутнасьці рабочае клясы на аснове росту сацыялістычнага будаўніцтва.

За 10 год свайго існаваньня Школа мае агромністыя дасягненьні, якімі Чырвоная Армія можа гаварыцца.

За 10 год свайго існаваньня, за 10 год упартай работы над часамі, малапісьменным людзкім матар'ялам, школа ўліла ў рады Чырвонай Арміі 1850 камандзіраў. Шмат якія з іх прайшлі ўжо сваё першае «базовае храшчэньне», ліквідуючы белабандытаў, а таксама героічна абараняючы Савецкі Саюз ад беларускіх авантурыстых.

Партыя, рабочая кляса, паставіла задачай перад вайсковымі навучальнымі установамі, каб камандзір, які выпушчаецца з гэтых устаноў, адпавядаў на сваёй падрыхтоўцы сучасным умовам вядзеньня і кіраўніцтва боем. Гэта задача вызначае вымест работы школы па падрыхтоўцы камандзіраў.

Выкананьне гэтай задачы, гэтых канкрэтных патрабаваньняў, якія прад'яўляе партыя і рабочая кляса да школы, можа быць ілюстравана вынікамі. У 1930 годзе Школа па сваёй тактычнай і стралковай падрыхтоўцы вышла на першае месца ў Беларускай Вайсковай Акрузе, а на Усесаюзных спаборніцтвах заняла другое месца ў РСЧА.

Гэтыя свае посьпехі школа дасягнула на аснове ўдарнай работы мэтадам сацыялістычнага будаўніцтва: сацыялістычнага спаборніцтва, ударництва на аснове шырачэйшай актыўнасьці курсантскай масы і начальніцкага складу, на аснове адданасьці курсантаў і камандзіраў рабочай клясе.

Школа зараз занята вырашэньнем складаных на сваіх ляжасьцях задач, якія стаяць перад Чырвонай Арміяй. Аўладаньнем складанымі формамі бою, аўладаньнем новай тэхнікай, якой аснашчаецца наша Чырвоная Армія. Комуністычная партыя, рабочая кляса, працоўныя масы Савецкай Беларусі і Саюзу ССР могуць быць упэўненымі

Нач. Школы ВАСІЛЕВІЧ.

чаньні поўнай абароназдольнасьці Рэспублікі. Гэта значыць, што неабходна прыцягнуць для абароны краіны працоўных усіх нацый.

Канкрэтнай формай гэтага зьяўляецца фармаваньне нацыянальных часьцей Чырвонай Арміі. Нацыянальныя фармаваньні па сутнасьці сваёй і значэньні, што працоўныя ўсіх нацыянальнасьцей прыцягнуты да справы абароны сацыялістычнай бацькаўшчыны. На цыянальныя фармаваньні лішні раз да ведаць, што Чырвоная Армія неадлучальна ад працоўных мас, лішні раз даводзіць не інтэрнацыянальны зьмест. А ўсё гэта ў сваю чаргу аказвае дадатковую сілу Чырвонай Арміі і пралетарыяту.

У першыя дні рэвалюцыі ня было магчымасьці прыступіць да фармаваньня нацыянальных часьцей таму, што для гэтага ня было адпаведных умоў. У працэсе грамадзянскай вайны стыхійна ўзьнікалі асобныя атрады нацыянальных войск, якія вярэдка называлі ўзоры тэрызму.

Роснасьць гаспадарчага і культурнага ўзроўню народаў Саюзу ССР, адсутнасьць у пэрэду народаў СССР вайсковай падрыхтоўкі ў мінулым, адсутнасьць камандзнага нацыянальнага складу не дазваляді асабліва шырока рухацца па шляху утварэньня нацыянальных часьцей і ў першыя гады мірнага будаўніцтва Чырвонай Арміі.

Пасьляховае вырашэньне нацыянальнага пытаньня на аснове правільнай Ленінскай нацыянальнай палітыкі партыі, гаспадарчы і культурны рост народаў СССР, якія ў мінулым знаходзіліся пад падвойным прэсам сацыяльнага прыгнечаньня, зьяўленьне фактычнай вяроўнасьці працоўных розных нацыянальнасьцей СССР—зьявілася базай для утварэньня нацыянальных часьцей, для далейшага ўзмацненьня абароназдольнасьці СССР. Нацыянальныя фармаваньні—ёсьць неадлучная частка нацыянальнай палітыкі партыі. «Толькі на ўмовах поўнай нацыянальнай роўнасьці і нацыянальнай палітыкі Савецкага ўраду стала магчымым ажыцьцявіць невярэшымае для парызму і для капіталістычных краін пытаньне аб прыцягненьні ўсіх народаў да будаўніцтва ўзброеных сіл краіны» (Варашылаў).

Беларусія—краіна, насьпешчаная якой у сваім мінулым прыцягвалася да вайсковай службы, а рэвалюцыя і грамадзянская вайна ўтварыла, хоць і колькасна нешчаныя кадры камандзнага і палітычнага складу. Аднак, для ўтварэньня беларускіх часьцей гэтага складу было мала, ды пры тым ён ў большасьці сваёй быў русіфікаваны. Адсюль з тэхнічнасьцю вынікла вынікчай важнасьці задача: утварэньне новых кадраў камандна-палітычнага складу з рабочых і бядняцкіх мас карэннага насельніцтва.

Шляхі практычнага вырашэньня гэтай вышэйшай задачы знойдзены ва ўтварэньні вайсковых школ.

АБВШ вырасла з кароткатэрміновых курсаў па падрыхтоўцы камандзнага складу. Рэарганізацыя курсаў у школу, рост і посьпехі АБВШ адбіваюць рост баявой магутнасьці рабочае клясы на аснове росту сацыялістычнага будаўніцтва.

За 10 год свайго існаваньня Школа мае агромністыя дасягненьні, якімі Чырвоная Армія можа гаварыцца.

За 10 год свайго існаваньня, за 10 год упартай работы над часамі, малапісьменным людзкім матар'ялам, школа ўліла ў рады Чырвонай Арміі 1850 камандзіраў. Шмат якія з іх прайшлі ўжо сваё першае «базовае храшчэньне», ліквідуючы белабандытаў, а таксама героічна абараняючы Савецкі Саюз ад беларускіх авантурыстых.

Партыя, рабочая кляса, паставіла задачай перад вайсковымі навучальнымі установамі, каб камандзір, які выпушчаецца з гэтых устаноў, адпавядаў на сваёй падрыхтоўцы сучасным умовам вядзеньня і кіраўніцтва боем. Гэта задача вызначае вымест работы школы па падрыхтоўцы камандзіраў.

Выкананьне гэтай задачы, гэтых канкрэтных патрабаваньняў, якія прад'яўляе партыя і рабочая кляса да школы, можа быць ілюстравана вынікамі. У 1930 годзе Школа па сваёй тактычнай і стралковай падрыхтоўцы вышла на першае месца ў Беларускай Вайсковай Акрузе, а на Усесаюзных спаборніцтвах заняла другое месца ў РСЧА.

Гэтыя свае посьпехі школа дасягнула на аснове ўдарнай работы мэтадам сацыялістычнага будаўніцтва: сацыялістычнага спаборніцтва, ударництва на аснове шырачэйшай актыўнасьці курсантскай масы і начальніцкага складу, на аснове адданасьці курсантаў і камандзіраў рабочай клясе.

Школа зараз занята вырашэньнем складаных на сваіх ляжасьцях задач, якія стаяць перад Чырвонай Арміяй. Аўладаньнем складанымі формамі бою, аўладаньнем новай тэхнікай, якой аснашчаецца наша Чырвоная Армія. Комуністычная партыя, рабочая кляса, працоўныя масы Савецкай Беларусі і Саюзу ССР могуць быць упэўненымі

Некалькі гістарычных даведак

Як арганізавалася АБВШ

Грамадзянская вайна, якая разгарнулася пасьля Кастрычніка 1917 году патрабавала ад пралетарскай дзяржавы складаньня моцнай Чырвонай арміі, патрабавала пралетарскіх кадраў для кіраваньня Чырвонай арміяй. Выявілася неабходнасьць ў стварэньні сваіх вайсковых школ.

«Работа па абучэньні, выхаваньні новага афіцэрства выключна з асяродку рабочых і перадавых сялян складала адну з галоўных задач у справе складаньня арміі. Непрарыўны рост чысла інструктарскіх курсаў і іх выхаваўцаў сьведчыць аб тым, што вайсковыя вышэйшыя ўстановы гэтай задачы аддавалі ўсю сваю ўвагу, якую яна заслугоўвала». (VIII зьезд Камуністычнай партыі).

Маткай 81-х Менскіх пяхотных курсаў (адкуль створана АБВШ) зьяўляюцца 2-е Маскоўскія пяхотныя курсы. Яны выпучылі 180 выпрабаваных курсантаў, 6 чалавек камскладу, некалькі супрацоўнікаў на чале з Начальнікам курсаў Леандрам Паўлавічам Клаўз. Вось гэта ядро зьявілась ў Менск для стварэньня падрыхтоўчых курсаў. Гэтыя людзі не ў даўгу пролетарыяту Саюзу. Яны абаранялі Чырвоны Пэдэр ад авантурыста Юдзенча, удзельнічалі ў ахлабаненьні Украіны і Крыма ад нападу Дзянікіна і барона Врангеля. Шмат з іх прымалі ўдзел у слаўным бае пад ст. Арэхава.

«Неабходнасьць хуткага стварэньня курсаў патрабуе ад нас максымальнага напружаньня сіл. Цяжка вельмі цяжка ў разгромленым, і ограбленым белапалякамі Менску стварыць узорную вайсковую школу. Але дружнымі ўсіліямі ўсіх курсантаў будзе зроблена і немагчымае.

Усе мы павінны і аддамо ўсе нашы сілы, і я ўпэўнен, што слова «немагчыма» ня будзе мець месца ў нашай рабоце і ў вынніках яе.

Смела-ж за справу, дружнай, моцнай, пролетарскай сям'ёй. Няма сьвят. Нама гадзін, а ёсьць захопліваючая па цікавасьці справа і маладыя, ідэёвыя сілы». (З загаду па курсах № 4).

Вось як мы пачалі працаваць. Каб дапамагчы ідэёва і матар'яльна, над курсамі прыняў шэфства Саўнарком Беларусі, ад якога атрымалі сьцяг і курсы пачалі зваацца—81-е Менскія пяхотныя курсы камскладу, імя Саўнаркома Беларусі (10 красавіка 1921 г.).

Адказную работу укамплектаваньня курсаў да сталага лёку бярэ на сябе ЦК КП(б)Б і ЦК ЛКСМБ. Укамплектоўваюцца курсы галоўным чынам з раёнаў Беларусі. У красавіку работа скончылася.

Мэта падрыхтоўчых курсаў—падрыхтаваць курсантаў для паступленьня на гадовыя камандныя курсы. У сталіцы Беларусі—Менску неабходна мець камандныя курсы, якія рыхтавалі-б камандзіраў для беларускіх нацыянальных часьцей.

3 мая 1921 году падрыхтоўчыя курсы пераўтворваюцца ў камунальныя. Настаў перыяд мірнага будаўніцтва. Аднэй з чарговых задач і задач важнейшых у справе будаўніцтва Чырвонай арміі зьяўляецца шырокая поўная і ўсебаковая падрыхтоўка камандзнага складу. Гэту задачу ня могуць выканаць аднагадовыя камандныя курсы. Таму яны рэарганізуюцца. Шмат якія расфарміроўваюцца. Так, у 81-е Менскія камандныя курсы ўліваюцца 43-я Полацкія, 45-я Віцебскія, 55-я Жытомірскія, 87-я Раслаўскія (верасень-кастрычнік 1927 г.). Паляпшаецца стаяовішча застаўшыхся курсаў. Узмацняецца, дзякуючы сталаму зьбору, склад курсаў. Нарэшце расьце цэлая сетка нармальных школ, якія па сваёй праграме і часу, адведзены для праходжэньня праграм, цалкам задавальняюць задачам будаўніцтва Чырвонай арміі. 81-е Менскія камандныя курсы разгортваюцца ў Аб'яднаную Беларускую Вайсковую Школу, імя ЦВК БССР (5-га сьнежня 1924 г., загад № 1265).

Афіцыйнае адкрыцьцё школы, на якім быў паднесены ЦВК Беларусі—«шэфам школы» сьцяг з надпісам: «Аб'яднаная Беларуская імя Беларускага ЦВК камандная школа», які лічыцца школьным сьцягам, адбылося 3 лістападу 1924 году.

Шэфам Школы з красавіка м-ца 1924 году зьяўляецца Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Беларускай Рэспублікі.

Школа свой юбілей сьвяткуе 10-га лютага ў адзнаку заснаваньня 81-х Менскіх пяхотных падрыхтоўчых курсаў.

Так узьнікла і сфармавалася магутная кузьня, выхоўваючая кіраўнікоў барацьбы за вынішчэньне эксплёатацыі ва ўсім сьвеце.

Леанёнак.

Завяршыць паварот тварам да баявой падрыхтоўкі

Партарганізацыя да дзесяцігодзьдзя школы

10 год Школы—гэта дзесяць год упартай работы партарганізацыі. З сотнямі выпушчаных камандзіраў Чырвонай арміі партарганізацыя дала і сотні новых байцоў партыі. Налічваючы ў сваіх шэрагах дзесяткі, партарганізацыя у сваім колькасным і ідэёвым росьце, ва ўмовах зьменнага складу прышла да 10-й гадавіне колькасна вялікай, ідэёна непамерна узрослай і бальшавіцка згуртаванай, хаця і маладым, але моцным атрадам партыі ў барацьбе за не генэральную Ленінскую лінію. Партарганізацыя сыстэматычна і рашуча вяла барацьбу за ідэёвую чыстату сваіх шэрагаў, даючы рашучыя бае канкрэтным праявам контр-рэвалюцыйнага трацкізму і правага апартунізму у сваіх шэрагах, як на агульных пытаньнях партыйнай палітыкі, так і па пытаньнях баявой падрыхтоўкі. Былі і памылкі, але гэтыя памылкі выкрываліся і з прыступнай бальшавіком рашучасьцю выкараўліваліся.

У барацьбе з вялікадзяржаўным шавінізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, беларускім контр-рэвалюцыйным нацыянальным дэмакратызмам і шавінізмамі розных колераў, партарганізацыя настойліва ажыцьцяўляла ленінскую нацыянальную палітыку партыі ў нацыянальнай школе. У выніку—вялізарныя посьпехі: пераведзеньне большасьці дысцыплін на беларускую мову, пераход партыйна-палітычнай работы выключна на беларускую, значны рост ліку беларусаў у складзе школы.

Зрабіўшы рашучы паварот тварам да баявой падрыхтоўкі (праўда яшчэ далёка ня поўны) партарганізацыя узгалавіла ўскоранную актыўнасьць мас, стала на чале новых форм праяўленьня іх актыўнасьці, разгортваючы сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва, арганізуючы ўдарныя брыгады, грамадзкі бюксір, праводзячы дэкаду прадукцыі. Партарганізацыя павышала патрабаваньні да камуністаў і дабівалася лепшых паказальнікаў у баявой падрыхтоўцы, займаючы вядучую ролю (лепшае выкананьне стральбы, 58,5 проц. партыйцаў у камандзе снайпэраў).

Партарганізацыя рашуча змагалася за ўзмацненьне рэвалюцыйнай дысцыпліны і здаровае палітыка-маральнае станоўішча Школы і мае ў гэтым вялікія посьпехі.

Паказальнікам таму, што партарганізацыя здолела згуртавць вакол сябе

Сакратар парткалектыву АБВШ т. КАЗЛОЎСКІ.

склад школы, зьяўляецца вялікая цяга ў партыю (падана 150 заяў, прынята 115).

Уступаючы у 11 год работы партарганізацыя мэтадам бальшавіцкай самакрытыкі вынішчаючы многія недахопы ў сваёй рабоце, павінна валіраваць ўсе сілы і калектыўную волю да далейшага ўзмацненьня й росту сваіх шэрагаў, завяршыць свой канчатковы паварот тварам да баявой падрыхтоўкі і гэтым забясьпечыць поўнае выкананьне патрабаваньняў Рэвсавета на 1931 навучальны год.

Казлоўскі.

новішча і ідэалёгічную ўстойлівасьць рабочай, батрацка-бядняцкай і серадняцкай моладзі. Шэфства і сувязь школы з прадпрыёмствамі і наадварот зьяўляецца вузкім месцам у падрыхтоўцы кадраў. Трэба ў далейшым разгарнуць сыстэматычную ўзаемную сувязь школы з прадпрыемствамі і гэтым самым забясьпечыць пралетарскі уплыў на маладыя кадры, што рыхтуюцца ў сьценах школы для РСЧА.

Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на вярбоўку ў вайсковыя школы імённа лепшых перадавых рабочых, батракоў, калгасьнікаў—ударнікаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Уступаючы ў 11 год існаваньня камандны палітычны і курсанцкі склад школы бязумоўна з той-жа рашучасьцю і ўпартасьцю будзе весьці барацьбу за выкананьне загаду № 080 на падставе ударных тэмпаў, будзе весьці барацьбу за падрыхтоўку і ленінскае выхаваньне баявых камандзіраў Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі і за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі па сацыялістычным будаўніцтве і будаўніцтве Чырвонай арміі.

Конюхоў.

Кузьня кадраў

Супроць жаданьня генэралаў

«...Дайце нам сьці над сваімі слаўнымі баявымі сьцягамі... Вы іх утапталі ў грязь... Падніміце іх... Пакланецеся ім...»

Так закончыў сваю гарачую прамову генэрал Дзянікін 17-га чэрвеня 1917 году на нарадзе генэралаў пры Стаўцы Вярхоўнага Галоўнакамандуючага.

І генэралу Дзянікіну зрабілася дурна...

«А. Ф. Керэнскі падыйшоў да Дзянікіна, моцна паціснуў яму руку і дзякаваў генэрала за шчырую адкрытую прамову».

Так запісана ў пратаколе «гістарычнай» нарады.

Гэст надзвычайна характарны. «Цар» Аляксандр IV Керэнскі і «цар» Антон Дзянікін зьліліся ў адным пачуцьці адданасьці баявым царскім сьцягам...

А ў гэты ча....

Царскія сьцягі крываваю эдзаньню ўзьнімаліся над бяскрайнімі палямі Галіцыі.

— Вялікі наступ!—трубілі газэты.

— Непераможная расійская армія гоніць перад сабою ворага!»... брацалі зброяй царскія генэралы.

Хлусьнёй напыўнчаный імкнуліся нахіліць гарматнае мяса.

А ў паветры і бяз гэтага густа сьмярдзела трупярняй.

Здыхала царская Расія. У грязь клаліся набракшыя ў крыві царскія сьцягі. Новая бура хвалявала чырвань новых непераможных сьцягаў. Надыходзіла навала Кастрычніка...

— Зьвярніце аўтарытэт афіцэра!—са сярогатам зубоў патрабавала «высокая» генэральская нарада ў «высокапастаўленай» прастытутцы—Керэнскага.

Віхура рэвалюцыі «плявала ў вочы» абураным генэралам і зрывала афіцэрскія пагоны.

...Рабілася ня так, як жадалі генэралы:::

Сьцягі Кастрычнікавых перамог

І вось куток таго, чаго не жадалі генэралы.

Кузьня кадраў непераможнай Чырвонай арміі Аб'яднаная Беларуская Вайсковая Школа. Сёньня яна імянінніца—ёй 10 год. 10 год як адбіта апошняя спроба царскай Расіі і генэралаў іншых краін узьвяць з граёі «баявыя» царскія сьцягі. 10 год мінула з той пары, калі свае жаданьне вырашалі са зброяй у руках генэралы на франтох грамадзянскай вайны...

10 год як АБВШ выхоўвае і гартуе кадры для Чырвонай арміі, якая стаіць на варце завяёў Кастрычніка...

Узьнімаемся па сходах на другі паверх. Пляцоўка абнесеная нізкім бар'ерам. Вартавы стаіць ля сьцягу школы.

— Нам трэба зазьняць сьцяг.

— Ня пусьціць...—трэба выклікаць разводзячага...—дае даведку адзін з адказных працаўнікоў школы.

Вартавы, які ахоўвае сьцяг школы, які ахоўвае сьцяг барацьбы і перамог Кастрычніка, гэта—эмблема Чырвонай арміі, вернага вартаўніка Кастрычнікавых заваёў, вернага вартаўніка вялікай сацыялістычнай будоўлі ў краіне саветаў.

— Ня пусьціць!—гэтая ўпэўненасьць расьце на кожным кроку, калі мы абходзім кузьню кадраў—АБВШ.

«Нводнае пядзі чужой зямлі ня хочам. Але і сваёй зямлі ніводнага вяршка сваёй зямлі не аддамо нікому».

Гэтая ўпэўненасьць выказаная словамі тав. Сталіна, адчуваецца на кожным кроку.

Тутака няма тэй вайсковай муштры, якая існавала ў старой вайсковай школе царскага часу. Няма —«здрам-жалам дэс-тво», на якім выхоўвалася дысцыпліна, няма—«пад ружжо з поўнай выкладкай»...

Са сьцен глядзяць плякаты правадыроў Кастрычніка.

Сьцены гавораць аб новых мэтадах барацьбы за дысцыпліну.

«Хто зрывае дысцыпліну»...Ідзе сьпіс курсантаў, якія спазьніліся яўкай на 3-5-7 хвілін з водпуску. Шляхам грамадзкага ганьбаваньня змагаюцца арганізацыі і школы са зрыўшчыкамі дысцыпліны. Адна назва «зрыўшчык дысцыпліны» ў Чырвонай арміі робіць куды больш ўплыў, чым стаяньне з поўнай выкладкай пад ружжом, чым шматпавярховы фасонны афіцэрскі мат...

Пралетарская сьвядомасьць—вось асноўны сродак барацьбы за дысцыпліну.

Рыхтуецца баец для двух фронтаў

Вайсковая школа—кавалак той вялікай сацыялістычнай будоўлі, якая праходзіць у краіне саветаў. Гэта адчуваецца на кожным кроку. Баец Чырвонай арміі ня толькі баец для франтоў будучых войн, але і актыўны баец шырокага фронту сацыялістычнага будаўніцтва. Ён плошь ад плошчі, кроў ад крыві, сын пралетарыяту будуючага сацыялізм. Мэтады сацыялістычнай працы—ударніцтва і спаборніцтва прасякаюць вучобу ў школе. З вітрын і сьцен ля класных пакояў і спальняў на вас глядзяць плякаты—

— На буксір адстаючых!..

Ідуць прозьвішчы адстаючых, паказаны дысцыпліны, па якіх адстаюць курсанты. Да адстаючых прымацаваны курсанты, якія ўзялі на сябе абавязак дапамагчы дагнаць. Паказаны тэрміны.

Як гэта непадобна на тыя ўзаемадносіны, якія існавалі ў старой школе. Таварыская дапамога, упартая калектыўная работа, замест канкурэнцыі, падседжваньня, падхалімства...

Шуміць як вулей пчол, кузьня кадраў. Няма тут паказной штучнай дысцыпліны, але новая дысцыпліна, вынік глыбокай пралетарскай сьвядомасьці, вынік адданасьці інтарэсам свае клясы, —прасякае працу і ўсё жыцьцё школы.

Шмат прэмій і ўзнагарод мае школа і за лепшую стральбу, і за лыжны спорт, і за санітарную справу...

Ёсьць і свае вынаходцы ў школе. Не інжынэры, ня тэхнікі высокай кваліфікацыі, а простыя, свае людзі.

Вось ён сьлесар Караўлаў, рабочы-вынаходца, якому мог-бы пазайздросьціць спэц высокай кваліфікацыі. Яго вынаходніцтва—гэта яскравы паказьнік тых непамерных магчымасьцяй, якія захованы ў нетрах рабочае клясы. На яго вынаходніцтве вучыцца камандны склад перамоўных баёў будучых войнаў...

Сёньня АБВШ сьвяткуе 10 год свайго існаваньня. Яна заслужыла ордэн Працоўнага Сьцягу, які ўручыў ёй урад БССР.

Дасягненьні школы да 10-цігадовага юбілею гавораць аб тым, што сьцяг Кастрычніка знаходзіцца ў моцных руках, што верны вартавы Кастрычніка—Чырвоная армія, да гэтых сьцягаў ня пусьціць ворагаў заваёў пралетарскай рэвалюцыі.

Штацкі.

Васемнаццаць лепшых

Іх 18 лепшых ударнікаў, загартаваных Ленінскім гартам. Яны цьвёрда, рашуча, упарта, па бальшавіцку б'юцца за тэмпы, за якасьць і першымі усходзяць на вышыні, якія штурмуе ўся маса школы.

Яны лепшыя выяўнікі агульнага запалу, агульнага энтузіязму. Гэта байцы вялікай раці, якія прыйшлі ў школу ад машын ад калгасаў і фабрык, дзе яны панахалі працу і змаганьне. Рабочыя фабрык і заводаў сёньня з гордасьцю прачытаюць прозьвішча гэтых лепшых курсантаў, таварышоў па станку і цэху. Вось яны: Сянькевіч, Ліцьвінаў, Ермалаў, Філончык, Ляшчынін, Фралоў, Лістраценка, Фралкоў, Базыленка, Кіашна, Котаў, Казаневіч, Маргелаў, Казлоў, Дзярнач, Удотаў, Барадульнін, Лазюк.

У характарыстыках іх чытаем: «Зьяўляецца кіраўніком ударніцтва у сваім разьдзеле. Адстаючых бярэ на грамадзкі буксір, прымае актыўны удзел ва ўсёй грамадзкай партыйнай рабоце. Дысцыплінаваны. Мае падзякі». Вось іх заслугі перад школай Чырвонай арміі Савецкай краіны. Сёньня яны будуць урачыста узнагароджаны ЦВК БССР.

Слава лепшым.

Б. АЖГІРЭЙ.

Страявая падрыхтоўка раней і цяпер

На страявую падрыхтоўку у 25-26 годзе адводзілася шмат часу, ня гледзячы на тое што 70 проц. курсантаў былі з маладшага падрыхтаванага камскладу. Тактычная падрыхтоўка большасьцю сваёй праводзілась у летні час у полі. Курсанты добра ўцягваліся ў паход.

Дасягненьні ў стральбе былі невялікія. Падрыхтоўкі адстаючых па стралковай справе амаль не якой не вялося. Камсклад слаба ўлічваў стралковую падрыхтаванасьць кожнага курсанта. Матчасьць кулямётаў ведалі добра толькі паасобныя курсанты. Тэхніка работы пры кулямёце ў гэты пэрыяд была марудная. Тэорыю стральбы ведалі не дастаткова, не маглі вылічыць правападобнасьць па дальнасьці стральбы закрытых пазыцый.

Заняткі вяліся цалкам з усім курсам і таму камандзір у час заняткаў ня мог ахапіць усіх курсантаў.

У 1927 годзе значна павышаецца стралковая падрыхтоўка, павышаецца процант выкананьня стрэльб з кулямётаў і стрэльбаў, павышаюцца веды матар'яльнай часткі зброі. Тэорыі стральбы, тэхнікі работы, пачынаецца вывучэньне стральбы з закрытых пазыцый, разьвіваецца лыжная падрыхтоўка, праводзіцца шмат спаборніцтваў.

На фізкультуры курсанты ў гэты год занялі амаль усе першыя месцы ў Менскім гарнізоне, а таксама і акрузе.

Школа займае першае месца па стральбе ў акрузе.

1929-30 год дае яшчэ большыя паказьнікі стралковай і тактычнай падрыхтоўкі Школы.

Уся работа па баявой падрыхтоўцы вядзецца на падставе вучоту дасягненьняў на кожным занятку, на кожнай стральбе. Для падрыхтоўкі слабейшых па стралковай справе скарыстоўваюцца снайпэры.

Калі курсанты ў 1926 годзе пераход у 25 кілёмэтраў лічылі за лепшае праійсьці пяшком, чым на лыжах, то зараз каманда курсантаў едзе ў Маскву на лыжах з разьлікам праходзіць 60 кілёмэтраў у дзень.

Ганчарык.



Кулямётнае аддзяленьне, якое ўзяло 1-ае месца пры 10-кіл. пераходзе са стрэльбай.

Пасяджэньне партканлектыву АБВШ.

Вынаходца т. Караўлаў.



Сьцяг ад ЦВК

У Цэодаміта.

Заняткі па інжынэрнай частцы.

ЗАКОНЫ І ПАСТАНОВЫ ЎРАДУ БССР

Пастанова

Савету Народных Камісараў БССР

ПРА ПАРАДАК РАБОЧАГА ЗАБЯСЬПЕЧАНЬНЯ НА 1931 г.

Дасягненьні першых двух гадоў пяцігодкі ў галіне сацыялістычнае індустрыялізацыі краіны і рэканструкцыі с.-гасп. даюць магчымасьць у 1931 годзе, рашаючым годзе пяцігодкі, узмацніць забясьпечаньне асноўных кадраў рабочых важнейшых вучасткаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Для палепшаньня і ўпарадкаваньня рабочага забясьпечаньня Савет Народных Камісараў БССР—пастанаўляе:

1. Устанавіць з 1-га лютага 1931 г. пры групы цэнтралізаванага забясьпечаньня паводле сьпісаў №№ 1, 2, 3 Народнага Камісарыяту Гандлю.

2. Устанавіць наступныя сярэдня-гадавыя кантынгэнты забясьпечваемых у цэнтралізаваным парадку:

а) паводле сьпісу № 1—45,6 тыс. рабочых і 27,0 тыс. інш. прац.;

б) паводле сьпісу № 2—94,0 тыс. раб. і 116,4 тыс. інш. прац.;

в) паводле сьпісу № 3—72,0 тыс. 300 тыс. інш. прац.

3. Адміністрацыйны і інжынэрна-тэхнічны пэрсанал, які беспасэрэдна працуе на вытворчасьці забясьпечваецца нараўне з рабочымі гэтае вытворчасьці.

4. Зацьвердзіць разьмеркаваньне кантынгэнтаў па прадпрыемствах і мясцовасьцях паводле сьпісаў № 1 і 2 Народнага Камісарыяту Гандлю.

Зацьвердзіць разьмеркаваньне кантынгэнтаў па мясцовасьцях і групах працоўных паводле сьпісу № 3 Народнага Камісарыяту Гандлю.

5. Рабочыя важнейшых прадпрыемстваў раёнаў (шкляныя, папяровыя, тэкстыльныя, дрэваапрацоўчыя і спэцыялізаваных савецкіх гаспадарак, а таксама вясковае настаўніцтва) забясьпечваецца харчамі паводле норм рабочых № 3.

6. Даручыць Народнаму Камісарыяту Гандлю разам з Белкаапсаюзам устанавіць кантынгэнты, парадак і нормы забясьпечаньня іншага працоўнага насельніцтва раёнаў, прычым гэтае насельніцтва хлебам і цукрам забясьпечваецца паводле норм для сьпісу № 3.

7. Абавязаць Народны Камісарыят Гандлю і Белкаапсаюз пры ўдзелу ЦСПСБ і гарадзкіх саветаў праверыць фактычныя кантынгэнты забясьпечваемага насельніцтва, рашуча весьці змаганьне з «мёртвымі душамі» і наогул з разбазарваньнем дэяржаўных рэсурсаў.

8. Даручыць Народнаму Камісарыяту Гандлю і Белкаапсаюзу дабіцца правільнай пастаноўкі справы прымацаваньня забясьпечваемых да закрытых разьмеркавальнікаў, і недапушчэньня злоўжываньняў у гэтай справе.

9. Абавязаць Народны Камісарыят Гандлю і Белкаапсаюз рашуча змагацца за эканомію ў выдаткаваньні хлеба.

10. Прапанаваць НК Гандлю па лініі Белрыбы, а таксама Рыбаксаюзу ўзмацніць загатоўку і пастаўку сьвежай рыбы для ўзмацненьня забясьпечаньня паводле вызначаных плянаў і для ўзмацненьня грамадзкага харчаваньня.

11. Для зьмяншэньня дэфіцыту ў мясе, лічыць патрэбным усю прадукцыю адкормачных сьвіньняў ад адкормачных апэрацый ЦРК пакінуць у распараджэньні Белкаапсаюзу для рабочага забясьпечаньня і грамадзкага харчаваньня. Абавязаць Белкаапсаюз на працягу трох дзён падаць у Народны Камісарыят Гандлю плян адкорму і скарыстаньня сьвіньняў.

12. Фонды забясьпечаньня рабочых новабудоўляў, тарфянікаў, плав-складу, грузчыкаў разьмяркоўваецца Белкаапсаюзам пасьля узгадненьня з Народным Камісарыятам Гандлю.

13. Ускласьці на Белкаапсаюз адказнасьць за своячасовы нармальны завоз і прасоўваньне прадуктаў на месца і за бесьперабойнае забясьпечаньне імі.

14. Даручыць гарадзкім саветам, Белкаапсаюзу пры ўдзеле прафэсійных саюзаў і цэнтральнага і мясцовага друку правесьці шырокую растлумачальную працу сярод рабочых і інш. працоўных аб новых мэтадах забясьпечаньня.

Праз месяц заслухаць даклад Народнага Камісарыяту Гандлю і Белкаапсаюзу пра становішча рабочага забясьпечаньня.

15. Даручыць Народнаму Камісарыяту Гандлю на працягу 2-х дэкад распрацаваць пытаньне аб дадатковай выдачы дзіцячага пайка.

16. Скасаваць пастанову за 3 лістапада 1930 г. «пра ўвядзеньне новых наборных дакумэнтаў» (З. З. БССР 1930 г., № 41, паст. 272).

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР **Л. Дубавіцкі.**

28 студзеня 1931 г.
Менск.

Пастанова

Савету Народных Камісараў БССР

ПРА ХОД ЛЁНАЗАГАТОВАК У КАІМЯНСКІМ, ЛУПАЛАЎСКІМ, ПОЛАЦКІМ, ЖЛОБІНСКІМ І ВЕТРЫНСКІМ РАЁНАХ.

Выслухаўшы даклады Кармянскага, Лупалаўскага, Жлобінскага, Полацкага, Ветрынскага раённых выканаўчых камітэтаў пра ход лёназагатовак, СНК БССР адзначае, што:

а) памянёныя раённыя выканаўчыя камітэты не дааценілі вялізарнага палітычнага і эканамічнага значэньня лёназагатовак гэтага году і ня ўжылі сапраўдных рэальных захадаў, якія-б забясьпечылі своячасовае выкананьне загатоўчых плянаў;

б) у практыцы провядзеньня лёназагатовак у гэтых раёнах ёсьць яўна апартуністычныя факты (дача недастаткоых цьвёрдых заданьняў кулаку, неўжыцьцё рашучых захадаў для своечасовага спагнаньня лёну па цьвёрдых заданьнях, несвоечасовае рэагаваньне судовых органаў на справы аб невыкананьні цьвёрдых заданьняў, неналежнае разгортваньне масавай работы для пасьляховага выкананьня лёназагатовак;

в) да гэтага часу ў частцы з паказаных раёнаў мелі месца разважаньні аб нерэальнасьці плянавых заданьняў па лёназагатоўках, што дэмабілізавала патрэбную актыўнасьць для выкананьня лёназагатовак.

У выніку гэтага пляны лёназагатовак на 25 студзеня 1931 г. у пералічаных раёнах выконваюцца зусім нездавальняюча (па Ветрынскім раёне—3,4 проц., па Жлобінскім—5,9 проц., па Кармянскім—6,9 проц., па Лупалаўскім—21,3 проц., па Полацкім—22,3%).

Бяручы пад увагу паказанае вышэй, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Абвясьціць вымову Прэзыдыуму Ветрынскага раённага выканаўчага камітэту; паставіць на від прэзыдыумам Жлобінскага, Кармянскага і Полацкага раённых выканаўчых камітэтаў, паказаць Прэзыдыуму Лупалаўскага раённага выканаўчага камітэту на недапушчальна марудны ход лёназагатовак.

2. Прапанаваць паказаным раённым выканаўчым камітэтам бездакладна забясьпечыць пералом у ходзе лёназагатовак з тым, каб забясьпечыць выкананьне плянавых заданьняў.

3. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Гандлю на працягу 2-х дэкад далажыць СНК аб ходзе лёназагатовак у паказных раёнах.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР **Л. Дубавіцкі.**

8 лютага 1931 г.
г. Менск.

ПОКУЛЬ НЕ ПАЧАЛІСЯ АДЛІГІ

скарыстаць час для поўнага выкананьня плянаў загатоўкі і вывазкі лесу

Абвясьціць увесь люты—месяцам штурму прарываў на лесазагатоўчым фронце. Арганізуем да Х-га ўсебеларускага зьезду саветаў эшалёны чырвоных абозаў, суботнікі па загатоўцы і вывазцы лесу. Мацней ударыць па кулаку, які ня выконвае цьвёрдых заданьняў па вывазцы лесу

Пастанова ўраду ня выконваецца

„Месячнік лесазагатовак ня даў належнага пералому і лесазагатоўкі праходзяць зусім нездавальняюча“

Пастанова

Савету Нар. Камісараў БССР

ПРА ХОД ДРОВАЛЕСАЗАГАТОВАК.

Выслухаўшы даклад Лесбела пра ход дровалесазагатовак, Савет Народных Камісараў адзначае, што:

а) квартальны плян загатовак і вывазкі лесу ў студзені месяцы Лесбелам выкананы ў наступным разьмерах: загатоўлена дзелавой драўніны—30%, дроў—10,1 проц.: вывезена: дзелавой драўніны—101,1 проц. дроў—12,8 проц., што зьяўляецца зусім нездавальняючым і пагражае зрывам выкананьня пляну;

б) раённыя выканаўчыя камітэты і Лесбел ня ўжылі належных захадаў для выкананьня пастановы СНК БССР за 14 студзеня 1931 г. «Пра ход лесазагатовак і лесавывазкі ў асобным квартале і пра выкананьне пляну—1-га кварталу 1931 г.» (газ. «Савецкая Беларусь» за 1931 г. № 20);

в) месячнік лесазагатовак не даў належнага пералому і лесазагатоўкі праходзяць зусім нездавальняюча.

Бяручы пад увагу паказанае вышэй, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам неадкладна праверыць дзяйсьненьне сельсаветамі заданьняў да вёскі, двара і калгасу і дабіцца поўнага выкананьня гэтых заданьняў у вызначаны тэрмін;

2. Прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам і Леспрамгасам праверыць да 10 лютага г. г. выкананьне цьвёрдых заданьняў кулацка-заможнымі гаспадаркамі і калі гэтыя заданьні не выкананы—прыцягваць вінаватых да адказнасьці.

3. Для скарачэньня адлегласьці і канцэнтрацыі рубак, даручыць Лесбелу і раённым выканаўчым камітэтам зрабіць пераадвод лесасечнага фонду.

4 Прапанаваць Лесбелу палепшыць арганізацыйнае абслугоўваньне лесазагатовак на месцах, неадкладна зьняць з працы тых працаўнікоў, якія ня здольны ажыцьцявіць выкананьня вызначаных плянаў.

5. Прапанаваць Лесбелу выканаць постанову СНК БССР пра павялічэньне ўласнага транспарту з давядзеньнем да 5000 коняй і забясьпечыць бесьперабойную працу мэханічнага транспарту.

6. Адзначаючы зусім слабую работу ў арганізацыі ўдарных брыгад, прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам і лесапрамгасам неадкладна разгарнуць працу для ўвядзеньня на лесазагатоўках сацыялістычных мэтадаў працы, скарыстоўваючы для гэтага ў першую чаргу мабілізаваных на лесазагатоўкі камсамольцаў і студэнтаў.

7. Адзначаючы нездавальняючае абслугоўваньне лесарубаў і возчыкаў харчамі і фуражом, прапанаваць НК Гандлю і Белкаапсаюзу забясьпечыць поўную і своечасовую дастаўку на лесазагатоўкі харчоў і фуражу.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР **Л. Дубавіцкі**

3 лютага 1931 г.
г. Менск.

Месячнік лесазагатовак ня даў зруху

На лесазагатоўчым фронце Полаччыны ганебны прарыў

Ня гледзячы на правядзеньне месячніка лесазагатовак на Полаччыне, лесазагатоўчы фронт застаўся з такімі-ж прарывамі, якія сустракаліся і раней. Нават плян асобнага кварталу па Полацкім леспрамгасе быў выкананы з вялікімі прарывамі.

Лічбы даюць наступны малюнак выкананьня квартальных заданьняў 1930 г.: па загатоўцы будаўнічай драўніны яно выкананае на 80 проц., а па дровах—на 64 проц. З вывазкай справа абстаіць яшчэ горш. Вывезена будаўнічай драўніны толькі 16,5 проц., і дроў—41,2 проц.

Заданьне-ж першага кварталу 1931 году па 7 вучасткам Леспрамгасу Полацкага раёну малоецца наступным чынам: загатоўлена будаўнічай драўніны—19,5 проц. і дроў 9,8 проц. Вывезена будаўнічай драўніны 12 проц. і дроў 19 проц. Замест 2.752 падвод, якія прадугледжаны квартальным заданьнем, працавала па вывазцы лесу 998 падвод, а замест—890—168.

У раёне не мабілізавана грамадзкая думка вакол месячніка лесазагатовак. Забясьпечэньне лесазагатовак гужавой сілай пастаўлена дрэнна. Сельсаветы проста не падпарадкаваюцца дырэктывам РВК.

Пры правядзеньні лесазагатовак на Полаччыне яшчэ пануюць непаразуменьні ў разьмеркаваньні рабочай сілы і ў забясьпячэньні лесарубаў прамысловымі таварамі. Частка лесарубаў надзвычайна кепска забясьпечана харчаваньнем, вопраткай і абуткам.

Па вучастках Леспрамгасу разьмешчаных на Полаччыне лесазагатоўчы плян фактычна правальваецца, а кіраўнікі лесазагатоўчых арганізацый ня прымаюць ніякіх крокаў да зьнішчэньня прарываў.

Нельга не зазначыць, што і раённыя арганізацыі не надалі належнай увагі месячніку лесазагатовак.

Да пачатку сплаву Полаччына зусім не падрыхтавана. Амаль ва ўсіх пытаньнях, зьвязаных са сплавам, панує проста неразьбярыха.

Камсамольская арганізацыя не надала ўвагі лесазагатоўкам і нават ня справілася з задачай мабілізацыі камсамольцаў на лесазагатоўкі.

Тут проста змазваецца палітычная важнасьць лесазагатовак, як адной з важнейшых работ нашага сацыялістычнага будаўніцтва. **Баз. Румянец.**

Віцебскі раён ганебна адстае

Па Віцебскім раёне ня ўжыты належныя мерапрыемствы, каб стварыць умовы да поўнага выкананьня лесазагатовак і вывазкі лесу.

Пагражаючае становішча і нядбайнасьць ў выкананьні заданьняў ураду відаць з лічбаў лесазагатовак і вывазкі за апошнія дні студзеня месяца. Аб гэтым яшчэ больш яскрава гавораць лічбы аб колькасьці працуючых возчыкаў і лесарубаў.

Па загатоўках па нарадах павінны былі працаваць на Віцебскім вучастку—1980 возчыкаў і 2480 лесарубаў, а на справе ў апошнія дні студзеня ў сярэднім працавала 295 возчыкаў і 10 лесарубаў.

Па Старасельскім вучастку павінна было працаваць 1300 возчыкаў і 2190 лесарубаў, а працавала 120 возчыкаў і 100 лесарубаў.

Па Лосьвіцкім вучастку павінна было працаваць 840 возчыкаў і 100 лесарубаў, а працавала 52 возчыкі і 28 лесарубаў.

Па Скрыдлеўскім вучастку, дзе павінны былі працаваць 1700 возчыкаў і 2250 лесарубаў, працавала 270 возчыкаў і 75 лесарубаў.

Зразумела, што пры такім становішчы амаль-што ўвесь высечаны лес застаўся на месцы, а гэта пагражае нашаму сацыялістычнаму будаўніцтву.

Райвыканком і сельсаветы толькі ў апошні час пачынаюць ствараць умовы для таго, каб дагнаць низроблянае. Раённыя арганізацыі паставілі перад сабой задачу—**да пачатку сакавіка—ніводнага бервяна не павінна застацца ў лесе.**

Лясное вока.

Чырвонымі абозамі

ліквідуем прарывы ў лесазагатоўках

Брыгадзір заводу «Бальшавік» тав. Крыгерман, які выяжджаў у Койданаўшчыну ў першых лічбах студзеня, вярнуўся з лесазагатовак і паведамляе:

Нам прышлося сустрэць вялікія труднасьці. Кулакі і падкулачнікі вялі шалёную агітацыю супроць лесазагатовак. Намі было праведзена больш 20 сходаў бяднякоў-серадняцкіх гаспадарак. Вынікам такой работы было тое, што ў Дубровенскім сельсавеце быў арганізаваны чырвоны абоз з 300 фурманак у падарунак VI зьезду Саветаў Койданаўшчыны.

У в. Курганы нашай брыгадай быў арганізаваны калгас.

Бяднацка-серадняцкая частка вёскі запэўнівае партыю і савецкую ўладу ў тым, што плян па лесазагатоўках па іх раёне будзе выканан, што для гэтага яны прыложаць усе стараньні.

Янка Контус.

***

Грабаўскі сельсавет, Гомельскага раёну ў адзнаку 7 гадавіны сьмерці Ул. І. Леніна арганізаваў чырвоны абоз па вывазцы лесаматар'ялаў.

Насельніцтва горача адгукнулася на гэтае мерапрыемства. Увесь збор ад чырвонага абозу паступіць у карысьць дзяржбудаўніцтва.

А. Ермакоў.

Вітаю экстрактавы завод імя Варашылава

(РЭЧЫЦА).

У дзень урачыстага пуску першага ў БССР экстрактавага заводу шчыра вітаю рабочых і адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал з новаю перамогаю пралетарыяту на фронце сацыялістычнага будаўніцтва. Вітаючы Вас, я спадзяюся, што гэты завод будзе ўдарным і прыкладным як па выкананьні прамфінпляну, так і па якасьці выпрацоўванай прадукцыі.

Няхай жыве камуністычная партыя!

Няхай жыве дыктатура пралетарыяту!

Няхай жыве сацыялізм!

Намесьнік Старшыні Савету Народных Камісараў БССР БЭНЭК.

9-II-31 г.

З лістоў рабселькораў

У Чабатовіцкім сельсавеце, Уравіцкага р-ну, праведзена растлумачальная работа па падрыхтоўцы да пасеўкампаніі, пляны сяўбы зараз даводзяцца да пасобнага двара, ачышчаецца насеньне. Камсамольская ячэйка калгасу «Вэкер» і аграном Вільчынскі дзейна дапамагаюць рыхтавацца да сяўбы.

Барабанаў Л.

Падгайцаўскі сельсавет, Шклоўскага р-ну, уключыўся ў падрыхтоўку да веснавой сяўбы. Пляны пасеваў даведзены да двара. Ударныя брыгады ачышчаюць насеньне і правяраюць стан сельска-гаспадарчага інвэнтара. Падрыхтоўка да сяўбы праходзіць пад лёзунгам поўнай калектывізацыі сельсавету.

Селькор Я.

Ленінскі, Сераскі і Серадняковскі сельсаветы, Слуцкага р-ну, не давялі плянаў сяўбы да вёскі і да двара. Трыеры стаяць неадрамантаванымі, насеньне не ачышчаецца. Калгасы «Прамень Камуны», «Новы Мір», «Пераможца», імя Леніна, Карла Маркса, «Чырвоны Маяк» і «Рухавік» яшчэ ня скончылі малацьбы і зусім не пачалі падрыхтоўку да сяўбы.

Ю. П.

Сяляне Рудзенскага сельсавету, Сьмілавіцкага р-ну, высыпаюць попел на сьметнік замест таго, каб зьбіраць яго і скарыстаць на ўгнаеньне. **Сельсавет** і партыйная ячэйка нічога не зрабілі ў гэтай галіне.

Ул. Высоцкі.

Пасеўныя пляны да вёсак Скрыгалаўскага сельсавету, Петрыкаўскага раёну, не даведзены; сходаў па гэтым пытаньні не праводзілася. Партыйная і камсамольская ячэйкі ня думаюць аб дапамозе ў падрыхтоўцы да сяўбы.

Калгас «Праца» не забясьпечан насеньнем; сельска-гаспадарчы інвэнтар не рамонтуецца з-за адсутнасьці жалеза

Асіноўка.

Аршанскі Райпрафсавет тры разы склікаў нараду гаспадаркіжаў на пытаньні рамонту с.-г. інвэнтара. Нарада зрывалася таму, што прадстаўнікі Жылсаюзу, Белдзяржбуду і Прафшко.. лы ні разу не зьявіліся. Між тым, яны са сваімі майстэрнямі ў значнай меры могуць дапамагчы ў справе рамонту сельска-гаспадарчага інвэнтару.

А. К—н.

У радзе вёсак **Дукорскага сельсавету, Сьмілавіцкага р-ну,** не пачата ачыстка насеньня, не рамонтуецца сельска-гаспадарчы інвэнтар, не хапае жалеза, вугалю. Растлумачальная работы сярод насельніцтва аб важнасьці пасеўкампаніі не праводзіцца. Камсамольскія ячэйкі і сельсавет бязьдзейнічаюць.

Селькор Зорка.

Ніякай работы з рабселькорамі ў Лельчыцкім раёне не праводзіцца. Рабселькоры раёну не мабілізаваны на выкананьне чарговых задач партыі і ўраду.

Аб падрыхтоўцы да ўсесаюзнай нарады па рабселькораўскім руху, аб узьнімцы работы сярод рабселькораў РК КП(б)Б і ня думае.

Заметкі дасыланыя на расьсьледваньне марынуюцца.

С. І.

Па Дамаванічскім сельсавеце, Мазырскага раёну, з селькорамі ніякай работы не вядзецца. У Ш.К.М. арганізаваны селькораўскі гурток, які не працуе. Селькораўскія брыгады таксама не працуюць.

Верас.

Работа з рабселькорамі на Старасельскім сельсавеце, Копыскага раёну, ніякая не вядзецца. За апошнія два гады ніякіх сходаў і нарад рабселькораў не праводзілася.

На раёне не арганізавана ніводнай селькораўскай ударнай брыгады.

Селькор Я. К-в.

АПАВЯШЧЭНЬНЕ

Зьмяшчаючы ніжэй сьпіс таварышоў, Парткалегія ЦКК КП(б)Б просіць памяненых таварышоў зараз жа паведаміць у парткалегію месца свайго знаходжаньня, месца працы і якую займае пасаду.

Просьба да ўсіх ячэек і РК КП(б)Б тэрмінова з свайго боку даць такія жа зьвесткі у парткалегію.

1. Трышкін Грыгорый Аляксеў, 2. Цінінт Люцій Іванаўна, 3. Емельянаў Фёдар Якаўлеў, 4. Морхаеў Залман Рувінаў, 5. Малышкін Нікіфар Грыгор'яў, 6. Малаковіч Антон Кандратаў, 7. Коласаў Кузьма Барысаў, 8. Шэўчык Уладзімір Данілаў, 9. Раманенка Ефім Нікалаяў, 10. Маліноўскі Нікалай Ларыонаў, 11. Рудзенка, Павел Сымонаў, 12. Маленковіч Нікалай Нікалаяў, 13. Русецкі Эдмунд Сігізмундаў, 14. Федарынчык Дзьмітры Міхасеў, 15. Галонаў Іосіф Абрамаў, 16. Самадураў Сяргей Апанасаў, 17. Саутосін Усьцінаў, 18. Несьцер Сьцяпанаў Антонаў, 19. Фішэр Нісон Барысаў, 20. Максімаў Павел Семенаў, 21. Нікчэмны Сямён Лазараў, 22. Бароўскі Ільля Ісааковіч, 23. Багушэвіч Аляксандр Лаўрэнцьяў, 24. Шнэйдэр Самуіл Нахманаў, 25. Міркон Осіп Саламонаў, 26. Меерзон Наум Семенаў, 27. Казарноўская З. М., 28. Гок Арон Абрамаў, 29. Казлоўскі Міхась Іванаў, 30. Оліў Лазар Максімаў, 31. Малиноўскі Нікалай Ларіонаў, 32. Фалкін Ісаак Саламонаў, 33. Прыабражэнскі Сяргей Нікалаяў, 34. Грушэўскі Аляксей Панцелеў, 35. Белы Андрэй Іванаў, 36. Сасонка Ахраім Сімонавіч, 37. Галкін Данілаў Зіноўеў, 38. Туманаў Іван Іванаў, 39. Шчэгалаў Грыгорый Дмітрыеў, 40. Рэмлянская Дора Уладзіміраўна, 41. Пухоўскі Аляксандр Федаровіч, 42. Рутковскі Мацьвей Леонаў, 43. Гальперын П. Ю., 44. Кавалёў М. З., 45. Пешчык Сяргей Паўлаў, 46. Івокін Сяргей Іванаў, 47. Казлоў Васілій Пілінаў, 47. Рэпінскі Аркадзі Іванаў, 48. Нікіцін Іван Сідараў, 49. Кротаў Емельян Нікалаеў, 50. Печатнікаў Сямён Міхасеў, 51. Дубровскі Уладзімір Сьцяпанаў (б. Магіл.), 52. Сухадольскі Пётр Іванаў (б. Магілеўск., парт. арг.), 53. Кардашэнка (б. Менскай партарганізацыі), 54. Файнгауз (б. Віцебскай партарган.), 55. Ропэ (б. Віцебскай партарганіз.), 56. Фельдман (б. Аршанскай партарганіз.), 57: Катковіч М. Фядотаў (б. Полацкай партарганіз.), 58. Лельчык Ф. А. (б: Мазырскай партарганіз.), 59. Вулеў (б. Бабруйскай партарганіз.), 60. Купцоў М. П.

15 лютага 1931 г. Ельскі РК КП(б)Б

склікае нараду рабселькораў-насьценкораў раёну.

НА ПАРАДКУ ДНЯ:

1) 2-я б льшавіцкая вясна і ўдзел рабселькораў;

2) пізавы друк і яго роля сучаснасьці;

3) даклад Селяніянскага ра селькораўскага гуртка аб працы.

На нараду запрашаюцца ўсе сакратары парт'ячэек раёну.

«Пра шахматнага і шашачнага чэмпіянату прафсаюзаў пераносіцца у клюб Мэталістых.

Чарговыя туры 10 лютага, а 8-й гадзіне ўвечары.

Чарговыя туры працасьветнага шахматнага турніра—у Доме Асьветы 11 студзеня.

а

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

ТЭАТР-КІНО

З ПАНЯДЗЕЛКА 9-га ЛЮТАГА

„Чырвоная Зорка“	Вялікі гукавы фільм **13 ДЗЁН** (справа „прапартыі“) Папярэдні продаж білетаў у тэатр. рабочай касе. Пачатак а 7, 8 г. 45 хв. і 10 г. 30 хв. Каса а 5 гадзіне.
Кіно-тэатр „Культура“	З аўторака 10 лютага **Сапраўднае жыцьцё** Пачатак а 7 г., 8 г. 40 хв., 10 г. 30 хв.
Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“	Мастацкі фільм нямецкай вытворчасьці **Горная баляда** У галоўн. ролях: Лені Рыфэншталь, Л. Трэнкер, Э. Пэтэрсон Пачатак 1-га сэансу а 6 гадз. Каса ад 4 гадз. 30 хв.
Кіно „ПРАЛЕТАРЫ“	2-гі тыдзень лепшы фільм сэзону **МАБУЛ** (Крававы патоп) Драма ў 9 частках Пачатак 1-га сэансу а 6 гадз. Каса ад 4 гадз.
Дзіцячы кіно тэатр „ЮНЫ ПІЯНЭР“	Эпізод з грамадзянскай вайны па аповесьці Д. Фурманава **МЯЦЕЖ** у 6 ці частках. Пачатак 1-га сэансу а 1 гадз. дню. Каса адчыняе ад 12 гадз. дню.

11-га лютага 1931 году

ЦЭНТРАЛЬНЫМ саветам прафсаюзаў

склікаецца прафактыў г. Менску

У парадку дня—даклад старшыні ЦСПСБ тав. Рыжова— **„Вынікі 5 пленуму ЎсеЦСПС“.**

Сход адбудзецца ў клюбе мэталістаў (Універсытэцкая вул., 12).

Пачатак роўна ў 7 гадз. вечара.

Білеты распаўсюджваюцца праз ЦП саюзаў.

Да ведама паляўнічых

ПАЛЯВАНЬНЕ на лісаў, зайцоў, гарнастаеў і ласак

АДТЭРМІНАВАНА па 1 сакавіка 1931 г.

НАРКАМЗЕМ Б ЛКАХО САЮЗ.

ГАЛОЎДАРТРАНС з усімі яго аддзеламі

ПЕРАЕХАЎ

у будынак быўш. „Дзяржстраху“ па Савецкай вул. д. № 68.

ІНСТРУКЦЫЯ

ДЛЯ ВЫДАЧЫ НАБОРНЫХ КАРТАК

працоўнаму насельніцтву гор. Менску.

1. Выдача наборных кніжак пачынаецца 6-II—20-II—31 г.

2. Выдача праводзіцца ў наступным парадку: працуючыя на прадпрыемствах, уваходзячых у сьпісы №№ 1, 2, атрымліваюць карткі на сваіх прадпрыемствах, а таксама члены сям'і—утрыманцы.

3. Усе іншыя працоўныя АТРЫМЛІВАЮЦЬ НАБОРНЫЯ КАРТКІ ў пунктах жактаў, раёнаў міліцыі і інтэрнатаў, буйных дамох, пасёлках і камгасных дамох.

4. Па гораду будуць адкрыты 24 пункты. У 4-х раёнах міліцыі па адным пункце ў кожным рэйне, і ва ўсіх ЖАКТ'ах. Грамадзяне, якія жывуць у ЖАКТ'ах атрымліваюць карткі ў ЖАКТ'ах, у камгаскіх і прыватных дамох—у пунктах раёнаў міліцыі, у пасёлках, інтэрнатах і буйных дамох па месцы жыхарства.

5. Згодна пастановы СНК, адказнасьць за правядзеньне працы па выдачы новых наборных картак ускладаецца: у ЖАКТАХ на старшыню ЖАКТ'у, у буйных дамох—на старшыню дамкому, у інтэрнатах—на старшыню дамкому, у інтэрнатах—на заг. інтэрнату, адказнасьць за выдачу новых наборных картак у раённай міліцыі ўскладаецца на прадстаўніка праўленьня МЦРК, нам. нач. міліцыі па адм. частцы і на прадстаўніка ад гарадзкога савету. На працягу ўсёй працы ўсе выпэйпаказаныя вызваляюцца ад працы.

6. У пунктах ЖАКТ'аў і міліцыі працу пачаць з 12-II—31 г. і скончыць 20-II- 31 г.

ПАЙШЧЫКАМ:

7. Пры атрыманьні новых наборных картак ПАТРЭБНА прадстаўляць НАСТУПНЫЯ ДАКУМАНТЫ:

1) дамавую кнігу, 2) паявую, наборную і дзіцячую кніжку, 3) членскі білет і разьліковую кніжку з афармленьнем за апошнія 3 м-цы зарплаты, даведку заўкому, мясцкому для ўстанаўленьня колькасьці асоб, якія знаходзяцца на ўтрыманьні, а таксама вылучэнцы рабочыя прадстаўляюць даведку ад адміністрацыі з дакладным пералічэньнем працы, якая імі выконваецца і другі дакумант, разьліковую кніжку і даведку аб вылучэньні. Дзеці павінны прадставіць мэтрыку аб нараджэньні ў 1919 годзе.

НЯПАЙШЧЫКАМ:

1. Для атрыманьня наборнай карткі—усе вышэйпералічаныя дакументы за выключэньнем паявой кніжкі і членскага білету саюзу.

2. Утрыманцы главы сям'і, я ія знаход яцца па-за Менскам, прадстаўляюць дакументы знаходжаньня на ўтрыманьні, даведку аб працы, якая выконваецца главою сям'і з паказаньнем яго заробку.

3. Утрыманцы страхкасы і Сабеву—пэнсійныя кніжкі, хатнія работніцы—прапоўны дагавор.

4. **Саматужнікі адзіночкі**—членскую кніжку таварыства саматужнікаў, патэнт на права працы.

5. **Пазбаўленыя права голасу,** якія маюць права на атрыманьне наборных кніжак,—даведку аб месцы працы, дзецям таксама мэтрыку аб нараджэньні ў 1919 годзе.

6. УТРЫМАНЦАМІ ЛІЧАЦЦА НАСТУПНЫЯ: жонка, ма ка, бацька, дзеці да 18 год, нямаючыя самастойнага заработку і неатрымліваючыя дапамогі са страхкасы, а таксама непрацаздольныя.

7. Усе наборныя кніжкі і карткі, якія знаходзяцца на руках у пайшчыкаў, сапраўдны на працягу 3-х месяцаў.

Нам. старшыні праўленьня МЦРК ТАРАСЕВІЧ.

Барысаўскі ЗАГС выклікае гр. Салаўёва Язэпа Лаўрэнавіча на 5 лютага 1931 г. у памяшканьне Загсу па справе скасаваньня шлюбу з гр-кай Наверын Надзяй.

Барысаўскі ЗАГС выклікае гр. Капылевіча Залмана Шыманавіча на 5 лютага 1931 г. у памяшканьне Загсу па справе аб скасаваньні шлюбу з гр-кай Шыфрын Іохай Янкелевай.

Менскі ЗАГС выклікае гр-на Витрэнка Данілу Радыёнава на 3 сакавіка 1931 г. па справе аб скасаваньні шлюбу з гр-кай Вятрэнка Мар'яй Андрэяўай.

Дырэктару гуты «Кастрычнік» Лісарэву Янку П., згодна пастановы Сьвіслацкага Нарсуду ад 30-XII—30 г., абвяшчаецца грамадзкае ганьбаваньне за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў.

Народны суд Капыскага раёну, на падставе прысуду ад 21 сьнежня 1930 г., абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне старшыні Александрыйскага сельсавету, Копыскага раёну, Ермакову Сьцяпану Авер'янавічу за нядбайныя адносіны да сваіх службовых абавязкаў.

Яўрэйскі нацыянальны суд гор. Менску абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне былому дырэктару фабрыкі «Усход» Ш. А. Ш., Кэрштэйну М. І. намесьніку дырэктара фабрыкі «Усход» і Мабелю Л. Н. бухгальтару пакінёнай фабрыкі па 196 арт. КК за тое, што ў верасьні м-цы, калі было напружанае фінансавае становішча, яны маючы на руках 5.000 руб. не здалі гэтыя грошы ў банк, а ашадвароч, дамагаліся ад банку выдачы ім грошай на выплату зарплаты за верасень і атрымалі 2.000 руб. у той час, кал. зарплата ўжо была выплачана за верасень.

За нядбайныя адносіны да сваіх абавязкаў, згодна прысуду Нарсуду Церахоўскага раёну, абвяшчаецца грамадзкае ганьбаваньне былому старшыні Ўнейскага сельсавету Рэўза Тодару

Старшыні кравецкай арцелі пас. Прадзянка, Сьвіславіцкага раёну Рыўкіну Элю Абрамавічу, згодна пастановы Сьвіславіцкага Нарсуду ад 16 студзеня 1931 г., абвяшчаецца грамадзкае ганьбаваньне за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў.

Загадчыку складу на ст. Рудзенск Сьмілавіцкага Райпажыўтаварыства Сухмону Бэньяміну і яго намесьніку Галубовічу Уладзіміру, згодна прыгавору Нарсуду Сьмілавіцкага раёну, абвяшчаецца грамадзкае ганьбаваньне за нядбайныя адносны да хлебазагатовак.

Супрацоўнікі рэдакцыі і канторы газэты „Савецкая Беларусь“ выказваюць сваё глыбокае спачуваньне тав. ШАСТАКОВУ П. П.

з прычыны сьмерці яго бацькі

Пётры Якімавіча

ЗГУБЛЕНЫ

Членскі білет № 62647 саюзу Будаўнікоў, выд. Калінкавіц. Рабчкомам, на імя Будовіч М. А.

Паявая кніжка № 3080, выд. Калінкавіцк. спажыв. т-вам, на імя Шчарбіна П. Б.

Паявая кніжка № 7175, выд. Калінкавіцк. спажыв. т-вам, на імя Зонов С.

Паявая кніжка № 3003, выд. Калінкавіцк. спажыв. т-вам, на імя Карсакоў С. Ф.

Паявая хлебная кніжка № 3004, выд. Калінкавіцк. спажыв. т-вам, на імя Бараноўскі В. М.

Атэстат аб сканчэньні сямігодкі, выд. Калінкавіцк. сямігодкай, на імя Гінзбург Ц. Л.

Хлебная кніжка № 1199, выд. Калінкавіцк. спажыв. т-вам, на імя Сухарэнка Ш. Б.

Паявая кніжка № 6, выд. Калінкавіцк. спажыв. т-вам, на імя Губараў А. Л.

Нарад № 43 на 100 скрынак, накладная № 4197, на імя Бдзеі А. Ф.

Паявая кніжка № 7481, выд. Калінкавіцк. сп